РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
9 СНЕЖНЯ 2025 г. АЎТОРАК № 237 (30625)



# ЧАС ЧАРОЎНЫХ ПАДАРУНКАЎ

Надвор'е пакуль зусім не навагодняе, але ж хіба толькі ад яго залежыць святочны настрой? Па ўсёй краіне распачынаюць сваю работу калядныя кірмашы (гэта фота, напрыклад, — з Віцебска), а на іх — чаго толькі няма — і забавы, і відовішчы. А самае галоўнае — падарункі. Ёлачныя аздабленні, чароўныя казачныя героі, навагоднія персанажы, сувеніры з атрыбутыкай надыходзячага года (сімвалам 2026-га, паводле ўсходняга гараскопа, будзе не міфічная ці экзатычная істота, а добра знаёмы нам конь). Карацей, парадаваць блізкіх, сяброў, калег дакладна ёсць чым. Дадаць утульнасці ўласнаму дому — таксама атрымаецца. А там, глядзіш, і снег пойдзе...

Фота БелТА.

НА ШЛЯХУ ДА СВАЙГО ПРАФЕСІЙНАГА ЛЁСУ

10




# СЛОВА — МАЛАДЫМ

**Першы маладзёжны ваенна-патрыятычны форум праходзіць у Мінску 8 і 9 снежня**



Фота БелТА.

На мерапрыемства, якое пачалося з дыялогавай пляцоўкі, прыехалі сотні юнакоў і дзяўчат з усіх куткоў краіны. Сярод іх і беларускія ўдзельнікі культурна-адукацыйнага праекта «Цягнік Памяці», і навучэнцы ваенна-патрыятычных класаў, і сувораўцы з выхаванцамі профільных ліцэяў. Ініцыятарам форуму выступіў Савет Рэспублікі пры падтрымцы сілавых ведамстваў краіны.

СТАР. 5

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

TikTok

ISSN 1990 — 763X
25237>
9 771990 763008




Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2026 года

Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!



# «ЦЯПЕР САМАЕ ГАЛОЎНАЕ — ТЭМПЫ»

## Вынікі вялікай камандзіроўкі Прэзідэнта — дамоўленасці на самым высокім узроўні ёсць. Час аператыўна іх рэалізоўваць

Вялікая камандзіроўка Прэзідэнта Беларусі, якую журналісты вобразна назвалі дыпламатычным марафонам, завяршылася. Гэта сапраўды быў марафон: з Кіргізіі — у М'янму, з М'янмы — у Аман, з Амана — у Алжыр, пасля зноў у Аман. Дзясяткі тысяч кіламетраў адлегласці, перагаворы на найвышэйшым узроўні па некалькі гадзін. Усё дзеля таго, каб умацаваць пазіцыі Беларусі, арганізаваць новыя выгадныя праекты, знайсці новыя рынкі. Каб развівалася эканоміка, а разам з ёй і краіна, каб людзям у гэтай краіне жылося лепш — каб была работа, годная зарплата, упэўненасць у заўтрашнім дні.

### З УЛІКАМ СПЕЦЫФІКІ РЭГІЁНА

Краіны «далёкай дугі», інтэнсіфікацыя супрацоўніцтва з імі — адносна новая для нас тэма, яна мае сваю спецыфіку, патрабуе ведання і дыпламатычнай інтуіцыі. У нашага Прэзідэнта яна ёсць, ён ведае, як і ў якім фармаце размаўляць з лідарамі краін, дзе іншыя, чым у нас, традыцыі вядзення спраў, і знаходзіць з імі агульную мову.

Напрыклад, у краінах арабскага Усходу перагаворы аб важным не вядуцца ў публічнай прасторы. Так было ў Алжыры і ў Амане.

**Прэс-сакратар Прэзідэнта Беларусі Наталля ЭЙСМАНТ** у эфіры тэлеканала



«Беларусь 1» адзначыла, што перагаворы паміж беларускім і аманскім бакамі мелі закрыты характар, паколькі такіх прынцыпаў прытрымліваюцца ў самім рэгіёне.

«У гэтым рэгіёне прывыклі працаваць у цішыні, і тут не трэба шукаць ніякіх скрытых сэнсаў. Гэта той фармат, у якім працуюць у гэтым рэгіёне», — сказала прэс-сакратар кіраўніка дзяржавы.

У краінах Персідскага заліва вялікую ўвагу ўдзяляюць сям'і, таму на перагаворах у Амане прысутнічалі сыны Аляксандра Лукашэнкі. Наталля Эйсмант растлумачыла, што гэта вельмі важна:

> **«У іх гэта сапраўды знак асаблівай павагі, асаблівай увагі і асаблівых адносін да развіцця двухбаковага ўзаемадзеяння, калі замацаваная асоба за ўзаемадзеяннем паміж краінамі, за супрацоўніцтвам — гэта прадстаўнікі сям'і. Вось у гэтым выпадку старэйшы сын Прэзідэнта», — заўважыла яна.**

Наталля Эйсмант дадала, што для Віктара Лукашэнкі, які кіруе Нацыянальным алімпійскім камітэтам, курыраванне адносін з Аманам — вельмі сур'ёзная дадатковая нагрузка і адказнасць. «Але ў гэтых краінах так прынята. І гэта сапраўды вельмі дапамагае. Гэта такая дадатковая ўвага, дадатковы кантроль. Гэта дае вельмі сур'ёзны штуршок для развіцця двухбаковых адносін. Вось таму на сустрэчы прысутнічалі сыны», — сказала прэс-сакратар Прэзідэнта.

У краінах Персідскага заліва размаўляць гатовы з моцнымі лідарамі, якія праводзяць незалежную палітыку дзеля свайго народа. Гэта яшчэ адна прычына, чаму Аляксандру Лукашэнку паспяхова ўдаецца дамаўляцца аб супрацоўніцтве і сумесных праектах.

> **«Беларусь стаіць на варце сваіх інтарэсаў. Гэта заслуга Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі, які зрабіў так, што Беларусь успрымаюць менавіта як сур'ёзную краіну, якой можна нешта прапанаваць,**

— адзначыў у эфіры тэлеканала «Першы інфармацыйны» **расійскі палітолаг, выкладчык эканамічнага факультэта РУДН Фархад ІБРАГІМАЎ**. — І калі Беларусі гэта будзе цікава, то яна на гэта адгукнецца. Таму Лукашэнку сустракаюць адпаведным чынам і ў Пакістане (да гэтага мы бачылі з вамі), і ў Амане, і ў Эміратах. Ён карыстаецца гіганцкай папулярнасцю ў краін Глабальнага Поўдня і на Блізкім Усходзе».

Эксперт зазначыў, што краіны гэтага рэгіёна няпростыя, не кожнага лідара або кіраўніка дзяржавы тут будуць успрымаць на роўных. Гаворачы аб Шольцы і Макроне, палітолаг выказаў меркаванне, што імі ў краінах Персідскага заліва пагарджаюць, таму што не бачаць у іх ніякіх лідараў. «Уладзімір Пуцін, Аляксандр Лукашэнка карыстаюцца гіганцкім аўтарытэтам. Блізкаўсходнія краіны разумеюць, што прыйдзе калі-небудзь час, калі нафты не будзе. Трэба развіваць нешта іншае. Дапусцім, Беларусь дэманструе поспех у развіцці сумесных прадпрыемстваў з тым жа Кітаем, з Расіяй. Гэта вельмі прыцягвае манархіі краін Заліва».

### «КАЛІ ХОЧАШ БЫЦЬ НАПЕРАДЗЕ — ТРЭБА БЕГЧЫ»



Менавіта гэты пасыл Прэзідэнта галоўны па выніках камандзіроўкі ў краіны «дальняй дугі» для тых, хто будзе выконваць заключаныя на найвышэйшым узроўні дамоўленасці па рэалізацыі важных для Беларусі праектаў.

«Прэзідэнт ад нас усіх патрабуе паскарацца. Як ён гаворыць, жыццё такое, што, калі хочаш быць наперадзе, трэба бегчы. І таму пакідаць на заўтра тое, што можна зрабіць сёння, — гэта тая раскоша, якая недазвальляльная. Тым больш задача стаць кратна нарасціць нашу прысутнасць і нашы адносіны з краінамі «далёкай дугі», — падкрэсліў **міністр замежных спраў Максім РЫЖАНКОЎ** у эфіры тэлеканала СТБ.

Ён, у прыватнасці, прыгадаў М'янму і Алжыр, куды Аляксандр Лукашэнка зрабіў афіцыйныя візіты. Яшчэ зусім нядаўна першая ў многім была для Беларусі тэра інкогніта, а з Алжырам супрацоўніцтва вельмі добра развівалася ў часы Савецкага Саюза, але потым гэты напрамак трохі забыўся.

Кіраўнік МЗС адзначыў, што, выбудоўваючы адносіны з краінамі «далёкай дугі», нельга толькі спрадычна глядзець у бок адпаведных рэгіёнаў і выбудоўваць адносіны час ад часу, паколькі стаіць задача ў тым ліку па дыверсіфікацыі экспарту на фоне санкцый Захаду.

# «БЕСПРЭЦЭДЭНТНЫ РАЗМАХ»

## Што аб вялікай камандзіроўцы Прэзідэнта Беларусі пісалі замежныя СМІ

Беларусь ужо даўно праяўляе цікавасць да краін «далёкай дугі». Аднак не толькі Мінск шукае перспектыўныя кірункі, але і краіны Глабальнага Поўдня, бачачы ў Беларусі новы пункт росту і апоры, імкнуцца наладзіць з намі ўзаемавыгадныя адносіны, адзначае тэлеграм-канал «Пул Першага» і прыводзіць вытрымкі з замежных СМІ.

Узаемная цікавасць збліжае Беларусь і Алжыр. Аб вялікім патэнцыяле нашых краін і неабходнасці надаць дынамікі двухбаковым адносінам актыўна пісалі алжырскія медыя.

*«У апошнія гады адносіны паміж Алжырам і Беларуссю дэманструюць узрастаючы палітычны і эканамічны імпульс, абумоўлены цвёрдай воляй лідараў дзвюх краін — Прэзідэнта Абдэльмаджыда Тэбуна і яго беларускага калегі Аляксандра Лукашэнкі — надаць стымул двухбаковым адносінам і ўмацаваць магчымасці для партнёрства і супрацоўніцтва»*, — адзначаў алжырскі тэлеканал ***Al24 News***. *«Прэзідэнт Лукашэнка наведаў Алжыр з першым афіцыйным візітам. Гэты візіт з'яўляецца часткай намаганняў па ўмацаванні двухбаковых адносін і адкрыцці новых магчымасцяў для супрацоўніцтва, — піша выданне **Le Jeune Independant.** — Абедзве краіны пашыраюць абмены ў розных сферах, адначасова ўзмацняючы каардынацыю ў міжнародных арганізацыях. Гэта дынаміка суправаджаецца значным умацаваннем двухбаковых палітычных і парламенцкіх сувязяў, што надае супрацоўніцтву беспрэцэдэнтны размах».*




Варта адзначыць, што супрацоўніцтва можа быць значна пашырана ўцягваннем у агульныя праекты Амана. Пры гэтым у Мінска і з Маскатам ёсць перспектыва ў двухбаковым супрацоўніцтве. Аб стратэгічным партнёрстве дзвюх краін можна прачытаць на старонках аманскіх СМІ.

*«Сустрэча ў палацы Аль-Барака прысвечана ўмацаванню двухбаковага партнёрства і папулярызацыі агульных эканамічных інтарэсаў, — пісала выданне **The Arabian Stories**. — Візіт падкрэслівае мацнеючае дыпламатычнае і эканамічнае ўзаемадзеянне паміж Аманам і Беларуссю, умацоўваючы агульную прыхільнасць да паглыблення сувязяў у многіх галінах».*

*«У ходзе сустрэчы былі разгледжаны кірункі інвестыцыйнага і эканамічнага партнёрства паміж дзвюма краінамі, а таксама шляхі пашырэння супрацоўніцтва ў мэтах забеспячэння ўзаемных інтарэсаў і садзейнічання росту эканомік Амана і Беларусі»*, — паведамляла выданне **Oman Observer**.

Тым часам «гістарычны візіт» Прэзідэнта Белапусі ў Нейп'ідо шырока асвятлялі м'янманскія СМІ. Адзначалася, што з пачатку года гэта ўжо трэцяя па ліку сустрэча Аляксандра Лукашэнкі з прэм'ерам М'янмы Мін Аун Хлайнам. Не абышлі ўвагай журналісты і той факт, што адна з вуліц Нейп'ідо атрымала назву Мінская.

*«Візіт Прэзідэнта Беларусі ў М'янму — гістарычны... Беларусь для М'янмы — адзін з самых надзейных партнёраў. І М'янма будзе заставацца адным з самых надзейных партнёраў для Беларусі»*, — піша **Global New Light Of Myanmar**.

**«Трэба шукаць сяброў, саюзнікаў па ўсім свеце», — заявіў міністр, адзначыўшы, што якраз на гэта і накіраваны такія «кумулятыўныя выезды», калі Прэзідэнт за адну камандзіроўку робіць некалькі візітаў у розныя краіны.**

Адказваючы на пытанне, як менавіта выбудоўваецца той ці іншы маршрут, Максім Рыжанкоў расказаў, што тут важна ўлічыць шмат фактараў, пачынаючы ад сумяшчэння графікаў лідараў краін, вырашэння магчымых пратакольных фармальнасцяў. Для некаторых краін, напрыклад, можа быць важна, каб менавіта да іх быў першы візіт. Часам таксама маюць значэнне некаторыя палітычныя нюансы: з якой краіны прыбыў і куды накіроўваешся пасля візіту. «Пытанне складанае і для пратакола, і ў палітычным плане», — адзначыў кіраўнік МЗС.

Прэзідэнт з усімі, з кім планавалася, пагаварыў, аб многім дамовіўся. Справа — за выкананнем, тым больш, як адзначае кіраўнік нашай краіны на ўсіх міжнародных сустрэчах, беларускі бок заўжды трымае сваё слова і ўсе дамоўленасці выконвае.

**«Галоўнае слова, якое мы чуем ад Прэзідэнта, — гэта тэмпы. Вось гэта цяпер самае галоўнае. На гэтым робіць акцэнт Прэзідэнт: ні ў якім разе не тармазіць, ні ў якім разе ніякіх бюракратычных прамаруджванняў, — адзначае Наталля Эйсмант. — Нічога не павінна перашкаджаць. Тэмп, тэмп, тэмп. Сферы вызначаны, праекты ёсць. Іх будзе яшчэ больш, але патрэбны тэмпы. Час цяпер такі, што не ісці, а бегчы трэба».**


Embrace the Future: Unfolding a New Chapter with a Fresh Vision
Global NEW LIGHT of MYANMAR
Four Objectives of the National Defence and Security Council
Belarus voices continued support for Myanmar worldwide

Яшчэ адна краіна, якую наведаў Аляксандр Лукашэнка падчас вялікай камандзіроўкі, — Кыргызстан. Прэзідэнт прыняў удзел у саміце АДКБ, выступіў з ацэнкамі па шэрагу рэгіянальных і глабальных пытанняў. Закрануў тэму Украіны і мірнага плана ЗША. Кіраўнік дзяржавы заявіў, што верыць у хуткае заканчэнне канфлікту.

Некаторым замежным дзеячам гэтыя словы прыйшліся не даспадобы. А аналітычнае выданне **Caliber_az** убачыла ў іх надзею: *«Хочацца верыць, што голас Беларусі — яшчэ адзін голас на карысць міру — можа стаць той кропляй, якая зменіць сітуацыю і пакладзе канец гэтай трагедыі, якая зацягнулася».*

БЕЛАРУСЬ БУДУЧЫНІ

# «ГЭТА ФОРУМ УСЯГО НАРОДА»




## Дэлегаты УНС ідуць на Сход з настроем на стваральную працу

Сярод амаль тысячы двухсот дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу людзі розных прафесій, яны прадстаўляюць розныя сферы жыцця, розныя рэгіёны. Але ўсе ідуць на форум з адчуваннем вялікай адказнасці за будучыню краіны і гонару за тое, што маюць да яе вырашэння непасрэднае дачыненне не толькі ад свайго імя, але і ад імя сваіх землякоў і калег.

**Дэлегат УНС, член Савета Рэспублікі, галоўны інжынер — першы намеснік генеральнага дырэктара ААТ «Магілёўхімвалакно» Канстанцін СІРОЦІН:**



— Для мяне быць дэлегатам УНС — значыць несці адказнасць за лёс сваёй краіны. А мы жывём у незалежнай, суверэннай, мірнай краіне, якая развіваецца, захоўваючы свае гістарычныя каштоўнасці. Таму наша найгалоўнейшая задача — берагчы і захоўваць тое, што нам дорага, што гадамі стваралася нашым народам.

УНС — унікальны інстытут, створаны з мэтай забяспечыць удзел грамадзян у кіраванні дзяржавай і абмеркаванні ключавых пытанняў развіцця краіны. УНС стаў важным элементам палітычнай сістэмы Беларусі і адлюстроўвае імкненне ўлад да пошуку новых форм узаемадзеяння з грамадствам. Гэта форум усяго народа, а падобны дыялог з народам — найвышэйшая форма дэмакратыі. Задача ж кожнага дэлегата застаецца нязменнай — падштурхнуць чалавека задумацца аб заўтрашнім дні, аб тых сацыяльных гарантыях, якія застануцца і будуць дзейнічаць доўгія дзесяцігоддзі, а не скончацца ў пэўны момант з сыходам кіраўнічых структур, якія адказваюць за імгненнае развіццё. Але тут трэба разумець, што, разлічваючы на паўсюдную падтрымку і клопат дзяржавы, чалавек павінен і сам прыкладаць намаганні, каб прыносіць дабро сабе і месцу, дзе нарадзіўся і жыве.

На другім пасяджэнні, да якога застаецца не так шмат часу, адным з пытанняў будзе зацвярджэнне Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2026–2030 гады. Дакумент задасць вектар развіцця краіны на будучую пяцігодку. Тут і ўстойлівае развіццё рэгіёнаў, і лічбавізацыя эканомікі, і мадэрнізацыя прамысловага сектара, і забеспячэнне эканамічнай бяспекі дзяржавы. Важны момант, што стварэнне і дапрацоўка праекта праграмы ажыццяўляліся ў цесным узаемадзеянні з грамадзянамі.

**Дэлегат УНС, член Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Руслан ВЯГЕРА:**



— Этапу прынясця Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2026–2030 гады папярэднічала карпатлівая праца ўрада і зацікаўленых профільных структур, уключаючы ўдзел дэлегатаў УНС. Гэта праграма неаднаразова абмяркоўвалася ў Авальнай зале Дома ўрада дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў, дзе карэкціраваліся палажэнні і напаўненне з улікам меркаванняў грамадзян, — падкрэслівае парламентарый. — Як прадстаўнік асобных раённых цэнтраў нашай краіны, выбраны дэлегатам УНС, я хацеў бы вылучыць у праграме важнасць сучасных і інавацыйных падыходаў да ўмацавання аграпрамысловага сектара сельскіх тэрыторый. Асаблівая ўвага ўдзяляецца падтрымцы і пашырэнню малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў рэгіёнах. Аднак асноватворным аспектам з'яўляецца раскрыццё чалавечага патэнцыялу, паляпшэнне ўмоў жыцця беларусаў ва ўсіх кутках нашай краіны за кошт павышэння стандартаў дабрабыту насельніцтва. Праграма мае дакладнае размеркаванне прыярытэтаў і грунтуецца на дзяржаўных і рэгіянальных праграмах развіцця. Гэта гарантуе яе эфектыўнае выкананне з пункту гледжання фінансавання і рэсурснага забеспячэння, а таксама сістэму паказчыкаў для ацэнкі дасягнення мэт з вызначэннем персанальнай адказнасці членаў урада.

**Дэлегат УНС, старшыня Лідскага раённага выканаўчага камітэта Аляксандр ВЯРСОЦКІ:**



— Чарговае пасяджэнне дэлегатаў VII Усебеларускага народнага сходу — працяг падзей, якія адбываліся сёлета, калі мы выбіралі Прэзідэнта нашай краіны. Мы не новага чалавека выбралі. Мы выбралі чалавека, якога вельмі добра ведаем. Ён не зменіць таго курсу, які праводзіць ужо больш як 30 гадоў. Грэе душу, што ўсё тое добрае, што ёсць у Беларусі, будзе мець свой працяг. Пацвярджэнне гэтаму — Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2026–2030 гады, якую мы, дэлегаты, будзем прымаць падчас Сходу. Яна прадугледжвае канкрэтныя меры па паляпшэнні дабрабыту нашых людзей. Адметна, што праектам гэтага найважнейшага дакумента запланавана будаўніцтва школы ў Лідзе на 1020 месцаў. Безумоўна, гэта падзея стане ўнёскам у дэмаграфічную бяспеку раёна, павысіць даступнасць адукацыі, што яшчэ раз пацвярджае сацыяльную накіраванасць нашай дзяржавы.

**Дэлегат УНС, інспектар па кадрах УКП ЖКГ «Бешанковіцкі камунальнік» Галіна САЛОХА:**



— Адным з ключавых пытанняў, якія будуць разгледжаны на сходзе, стане абмеркаванне выніку рэалізацыі Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2021–2025 гады, а таксама прыняцце адпаведнай Праграмы на будучую пяцігодку, мэта якой — фарміраванне самадастатковай і канкурэнтаздольнай дзяржавы, у цэнтры якой — чалавек. Вызначаны ключавыя прыярытэты, выдзелены канкрэтныя задачы, меры па іх рэалізацыі і гарантавана забяспечанае фінансаванне па кожным з гэтых пытанняў.

Асобна заслугоўвае ўвагі пытанне нацыянальнай бяспекі і абараназдольнасці Беларусі, інакш будзе проста немагчыма развіваць эканоміку, не маючы надзейнага шчыта. Работа дэлегата сёння не абмяжоўваецца адным удзелам у пасяджэннях. Важна ўвесь час быць сувязным звяном паміж дзяржавай і грамадствам. Як сказаў Прэзідэнт, тое, што мы прапішам і што будзе прынята на УНС, павінна няўхільна выконвацца.

Мяне і многіх бешанкавічан хвалююць простыя пытанні: захаванне насельніцтва ў сельскай мясцовасці, развіццё малых гарадоў, захаванне сацыяльнай сферы, добраўпарадкаванне, узровень заработнай платы. І асобна — важнасць выхавання гарманічнай і патрыятычнай асобы.

Як адзначыў Прэзідэнт, трэба настроіцца на добрую работу і памятаць: не зрабілі мы — ніхто не зробіць. Кожны павінен рабіць сваю справу. Кожны за свой кавалак зямлі, за свой кавалачак работы адказвае і павінен гэта рабіць. Гэта — галоўнае.

**Дэлегат УНС, загадчык філіяла «Звяняцкаўскі сельскі клуб» Хойніцкага раённага дома культуры Наталля ПІНЧУК:**



— Уражанні ад удзелу ў першым пасяджэнні VII Усебеларускага народнага сходу дагэтуль вельмі моцныя. Настолькі ўразіла прамова Прэзідэнта, зарадзіла стваральнай энергіяй, што не перадаць словамі. Пасля ўдзелу ў першым пасяджэнні выступала ў працоўных калектывах, імкнулася перадаць галоўную выснову, якую сама зрабіла пасля пасяджэння: у нашай Радзімы, акрамя нас, беларускага народа, няма нікога. Толькі мы ведаем, якой павінна быць будучыня нашай краіны, як зрабіць яе мацнейшай. Наш абавязак — быць вернымі і аддапымі сынамі і дачкамі нашага народа. А сілу чэрпаць — у спрадвечных сапраўдных каштоўнасцях, у імкненні да справядлівасці, у пачэснай працы. Мы павінны быць моцнымі і згуртаванымі, каб захаваць мір у сваёй краіне, нашы традыцыі і духоўны стрыжань. З такімі ж перакананнямі рыхтуюся да ўдзелу ў другім пасяджэнні VII УНС.

Так, я просты вясковы чалавек, для якога вялікая адказнасць прымаць удзел у абмеркаванні Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2026–2030 гады. Ведаю, што пры яе падрыхтоўцы ўлічана ўся інфармацыя, сабраная дэлегатамі на сустрэчах з працоўнымі калектывамі, з жыхарамі населеных пунктаў. Для мяне асаблівa значны прыярытэт праграмы «Моцныя рэгіёны». Гэта пра якасць жыцця не толькі ў буйных, але і аддаленых раёнах, невялікіх населеных пунктах. Для мяне як чалавека, які жыве і працуе ў другім па велічыні ў Хойніцкім раёне і найбольш пацярпелым ад аварыі на ЧАЭС Паселіцкім сельсавеце, гэта вельмі важна. Практычна ўсе нашы вёскі ў свой час трапілі пад абавязковае адсяленне. Колькасць жыхароў і ў цэлым домаўладанняў зменшылася амаль у чатыры разы. Але сёння мы беражом усё, што захавалася, і стараемся памнажаць зробленае. Толькі ў нашай вёсцы Звяняцкае амаль 80 жыхароў, жывуць шматдзетныя сем'і і каля трыццаці дзяцей школьнага ўзросту. Ад аднавяскоўцаў я навучылася галоўнаму: не бывае «чужых», старонніх праблем. За больш як дзесяць гадоў работы на вёсцы пераканалася, што калі чалавек прыходзіць з просьбай, значыць, ён верыць, што ты дапаможаш. Ганаруся тым, з якой адкрытасцю і самааддачай мае землякі гатовы даглядаць, добраўпарадкоўваць родную зямлю. Таму для мяне як дэлегата ўдзел у VII УНС — гэта, безумоўна, вялікая адказнасць перад землякамі, якія вераць, што я змагу данесці тое, чым яны жывуць.

**Паводле нашых карэспандэнтаў.**

МІЖПАРЛАМЕНЦКАЕ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ

# АД ХАРЧОВАЙ БЯСПЕКІ ДА КАНТАКТАЎ ПАМІЖ РЭГІЁНАМІ

## Парламенцкая дэлегацыя Кеніі знаходзіцца з афіцыйным візітам у Беларусі

Знаходжанне ў нашай краіне кенійскія парламентарыі пачалі з жэсту павагі да гісторыі Беларусі — дэлегацыя ўсклала вянок і кветкі да манумента Перамогі ў Мінску. Затым адбыліся перагаворы ў Савеце Рэспублікі, дзе абмяркоўваліся перспектыўныя кірунні далейшага супрацоўніцтва, якое не абмяжоўваецца міжпарламенцкім узаемадзеяннем.



Як звярнула ўвагу **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА**, Беларусь выбудоўвае добрыя, сяброўскія адносіны з усімі дзяржавамі, якія накіраваны на канструктыўнае, узаемавыгаднае супрацоўніцтва. «Прэзідэнт нашай краіны вельмі часта падкрэслівае, што будучыня — за афрыканскім кантынентам, — удакладніла спікер. — Спадзяёмся, што ваш візіт упіша новую старонку ў парламенцкае супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі, якое найперш будзе накіравана на выкананне тых дамоўленасцяў, якія былі дасягнуты на найвышэйшым узроўні».

Па словах Старшыні Савета Рэспублікі, у сучасным свеце міжпарламенцкае ўзаемадзеянне набывае асаблівае значэнне. «Мы шчыра рады таму, што паміж парламентарыямі нашых краін складваюцца такія добрыя, сяброўскія адносіны, — падкрэсліла яна. — У Нацыянальным сходзе створана рабочая група (па супрацоўніцтве з парламентам Кеніі. — **«Зв.»**). Спадзяёмся, што і ў Сенаце Кеніі будзе створана такая ж рабочая група, якая дазволіць нам больш шчыльна супрацоўнічаць па міжпарламенцкай лініі. Гатовы выбудоўваць нашы адносіны абсалютна па ўсіх кірунках: як у эканамічнай, так і ў гуманітарных сферах. Парламентарыі павінны актыўна ўключыцца ў рэалізацыю задач, якія стаяць перад намі».

Асобна прагучала пытанне далейшага супрацоўніцтва беларускіх і кенійскіх парламентарыяў у міжнародных парламенцкіх арганізацыях: такіх як Міжпарламенцкі саюз, Рух недалучэння, Панафрыканскі парламент, дзе нядаўна Беларусь атрымала статус назіральніка.

Гаворачы аб парламенцкім узаемадзеянні, Наталля Качанава адзначыла, што Савет Рэспублікі як палата тэрытарыяльнага прадстаўніцтва зацікаўлены ў рэгіянальным супрацоўніцтве Беларусі і Кеніі. Яна прывяла добрыя прыклады такога фармату ўзаемадзеяння з Расіяй і Узбекістанам. «Магчыма, і з Кеніяй мы выбудуем такія ж цікавыя праекты, якія будуць садзейнічаць супрацоўніцтву паміж нашымі народамі і краінамі», — канстатавала спікер.

**Спікер Сената Рэспублікі Кенія Амазон Джэфа КІНГІ** падзякаваў за высокі ўзровень дыпламатычных адносін паміж краінамі і выказаў спадзяванне на іх развіццё. «Мы ўпэўнены, што візіт Аляксандра Лукашэнкі ў Кенію ў снежні 2023 года ўмацаваў нашы адносіны, — канстатаваў ён. — Мы ўдзячныя за намаганні, прыкладзеныя двума прэзідэнтамі для ўстанаўлення кантактаў і супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі».

Асаблівую ролю ў развіцці ўзаемаадносін паміж краінамі спікер Сената Кеніі бачыць ва ўстанаўленні кантактаў на парламенцкім узроўні. «Дзеянні і намаганні, якія ў будучыні распачнуць заканадаўчыя галіны ўлады абедзвюх краін, будуць з'яўляцца асновай для працягу супрацоўніцтва, устаноўленага нашымі прэзідэнтамі, — удакладніў ён. — Асноўнай мэтай нашага візіту з'яўляецца ўмацаванне і ўстанаўленне сувязяў паміж парламентамі, каб мы маглі быць бліжэйшымі адзін да аднаго, узмацніць нашу работу».

У завяршэнні перагавораў бакі падпісалі Мемарандум аб супрацоўніцтве.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

### Да ведама

16 снежня 2025 г. Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Іванаўна Качанава правядзе асабісты прыём грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб у г. Мінску (вул. Чырвонаармейская, 9). Падрабязная інфармацыя — на сайце Савета Рэспублікі.

# «ПЕРАЙСЦІ НА БОЛЬШ ЯКАСНЫ ЎЗРОВЕНЬ ЖЫЦЦЯ ДЛЯ КОЖНАГА БЕЛАРУСА»

## Галоўныя акцэнты пасяджэння Савета па ўстойлівым развіцці

У панядзелак у беларускай сталіцы пад кіраўніцтвам Нацыянальнага каардынатара па дасягненні Мэт устойлівага развіцця, намесніка Старшыні Савета Рэспублікі Уладзіслава ТАТАРЫНОВІЧА адбылося пасяджэнне Савета па ўстойлівым развіцці. На ім падвялі вынікі работы нацыянальнага механізму па дасягненні МУР у краіне.



Па стане на 2025 год Беларусь займае 32-е месца са 167 краін свету ў міжнародным рэйтынгу МУР. Узровень прагрэсу складае больш за 82 %, паведаміў Уладзіслаў Татарыновіч. Наша краіна актыўна ўзаемадзейнічае па пытаннях устойлівага развіцця з партнёрамі па міждзяржаўных аб'яднаннях, такімі як ЕАЭС, СНД, ШАС. «Як у ААН, так і на названых пляцоўках ужо сёння актыўна вядзецца дыскусія аб тым, які будзе парадак устойлівага развіцця пасля 2030 года, — адзначыў Уладзіслаў Татарыновіч. — Мы таксама не стаім на месцы. Сёлета ў нашай краіне зацверджана абноўленая Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця да 2040 года, якая паслужыць стратэгічным арыенцірам для ўсяго механізму па рэалізацыі МУР у Беларусі і вырашэнні задач пасля 2030 года. Магчыма, з улікам нейкіх новых задач, якія сфармулююць да 2030 года, трэба будзе зрабіць некаторыя дапаўненні і актуалізаваць нашу нацыянальную стратэгію. Гэта работа будзе праводзіцца ў планавым, але абавязковым парадку».

### ДОСТУП ДА САЦПАСЛУГ, НІЗКАЕ БЕСПРАЦОЎЕ, РОСТ ВУП

Сёлета Белстат упершыню ажыццявіў комплексную ацэнку прагрэсу ў дасягненні Мэт устойлівага развіцця на нацыянальным і рэгіянальным узроўнях, расказаў **намеснік старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта Аляксей ЯРКАВЕЦ.** Паводле яго слоў, разлікі заснаваныя на даных за перыяд з 2015-га да 2024 года. На нацыянальным узроўні 82,3 % паказчыкаў прадэманстравалі значны прагрэс і дасягненне высокіх вынікаў. «Вынікі ацэнкі наглядна пацвярджаюць, што ўжо цяпер па шэрагу паказчыкаў мы не толькі выканалі пастаўленыя задачы, але і займаем лідзіруючыя пазіцыі ў параўнанні з асобнымі краінамі, — адзначыў Аляксей Яркавец. — Важным дасягненнем з'яўляецца забеспячэнне ўсеагульнага доступу да базавых сацыяльных паслуг: адукацыі, аховы здароўя, электраэнергіі, якаснага жылля, водазабеспячэння і санітарыі, а таксама сувязі і грамадскага транспарту. Гэта сведчыць аб высокім узроўні якасці жыцця насельніцтва».

Дакладчык таксама падкрэсліў, што ўстойлівая станоўчая дынаміка ў пытаннях забяспечанасці насельніцтва жыллём, даступнасці гарадской інфраструктуры і захавання культурнай спадчыны стварае аснову для стабільнай і бяспечнай будучыні грамадзян. Паспяхова рэалізоўваюцца ініцыятывы ў галіне гендарнай роўнасці, пашыраюцца правы і магчымасці жанчын, што пацвярджаецца ростам паказчыкаў, якія характарызуюць іх эканамічную і палітычную актыўнасць.

У эканамічнай сферы таксама назіраюцца пазітыўныя тэндэнцыі. У Беларусі адзін з самых нізкіх у свеце ўзроўняў беспрацоўя. Адзначаецца рост ВУП і прадукцыйнасці працы. Аграпрамысловы комплекс цалкам забяспечвае харчовую бяспеку краіны. Экалагічныя намаганні накіраваны на захаванне біяразнастайнасці і павелічэнне лясных рэсурсаў. Усе дасягненні падкрэсліваюць комплексны падыход да развіцця чалавечага капіталу і нацыянальнай эканомікі. «Разам з тым варта адзначыць, што ёсць кірункі і задачы, якія патрабуюць дадатковых намаганняў, такія як прыцягненне замежных інвестыцый у Беларусь, нарошчванне патэнцыялу высокатэхналагічных вытворчасцяў, захаванне клімату, экалагічна рацыянальнае выкарыстанне рэсурсаў, якое забяспечвае зніжэнне нагрузкі на экасістэму», — падкрэсліў намеснік старшыні Белстата.

Таксама сёлета Белстатам упершыню ажыццёўлена ацэнка прагрэсу рэгіёнаў у дасягненні МУР. Па выніках праведзенай ацэнкі прагрэс дасягнення МУР Мінскай вобласцю склаў 80,9 %, Брэсцкай — 80,2 %, Віцебскай — 79,2 %, Гомельскай — 77,7 %, Гродзенскай — 77,1 %,

ПЛАНЫ САЮЗНЫЯ

# У АСНОВЕ — ПЕРАЕМНАСЦЬ І ВЕРНАСЦЬ ІДЭАЛАМ

**Беларускія парламентарыі прымаюць удзел у мерапрыемствах Парламенцкай асамблеі АДКБ у Маскве**

Учора ў расійскай сталіцы адбылося пасяджэнне Савета Парламенцкай асамблеі АДКБ і 18-е пленарнае пасяджэнне Парламенцкай асамблеі АДКБ.

На сумесным пасяджэнні кіраўнік беларускай парламенцкай дэлегацыі **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА** адзначыў: «Падзеі, якія адбываюцца сёння, паказваюць бездань паміж спадзяваннямі простых людзей і палітыкай, што праводзіцца цяперашнім кіраўніцтвам еўрапейскіх краін. Ігнараванне прынцыпу непадзельнасці бяспекі, гонка ўзбраенняў, недарэчнае разважанне аб непазбежнасці новай вайны ў Еўропе — за гэтым дакладна прасочваецца імкненне да рэваншу».

Ігар Сергяенка звярнуў увагу на тое, што адзінай альтэрнатывай для чалавецтва з'яўляюцца сумленны і адкрыты дыялог, выпрацоўка механізмаў і гарантый калектыўнай бяспекі, фарміраванне светаўладкавання пры непасрэдным удзеле глабальнай большасці. Кіраўнік беларускай дэлегацыі дадаў, што ў краінах НАТА і ў іх саюзнікаў нарастае незадаволенасць курсам, аб чым сведчаць шматлікія акцыі грамадзянскага пратэсту. «Людзі хочуць міру, стабільнасці і дастатку, а ім прапануюць рост цэн, скарачэнне працоўных месцаў, урэзанне заработнай платы і дапамог, а ў перспектыве — гібель у акопах незразумелай вайны», — канкрэтызаваў Старшыня Палаты прадстаўнікоў, удакладніўшы, што Беларусі ёсць што прапанаваць тым палітыкам, хто сапраўды думае пра нацыянальныя інтарэсы, будучыню сваіх народаў.

Па словах Ігара Сергяенкі, парламенцкае вымярэнне ў рамках АДКБ з кожным годам набывае ўсё больш дакладныя кірункі дзейнасці і прыярытэты, удасканальваюцца інстытуты арганізацыі. «Нягледзячы на высокую дынаміку працэсаў, што адбываюцца, выкліканую ў тым ліку геапалітычнымі фактарамі, якія пастаянна змяняюцца, мы захоўваем пераемнасць, вернасць ідэалам, якія ляжаць у аснове функцыянавання АДКБ», — падкрэсліў ён.

Парламенцкай асамблеяй АДКБ адобрана мадэльнае пагадненне аб супрацоўніцтве дзяржаў — членаў АДКБ пры выкарыстанні новых відаў зброі і тэхналогій у мэтах забеспячэння калектыўнай бяспекі і захавання прынцыпаў і норм міжнароднага гуманітарнага права. На пасяджэнні прыняты рэкамендацыі па ўдасканаленні заканадаўства дзяржаў — членаў АДКБ у сферы грамадзянскай абароны, па збліжэнні і гарманізацыі крымінальнага і адміністрацыйнага заканадаўства дзяржаў — членаў АДКБ у галіне бяспекі крытычнай інфармацыйнай інфраструктуры, па гарманізацыі крымінальнага заканадаўства дзяржаў — членаў АДКБ, якое



Фота Упраўлення прэс-службы і інфармацыі Дзяржаўнай Думы РФ.

ўстанаўлівае адказнасць за злачынствы супраць міру і бяспекі. Акрамя таго, прыняты мадэльны закон аб супрацьдзеянні тэрарызму, заява аб забеспячэнні міжнароднай бяспекі ва ўмовах шматпалярнага свету, які фарміруецца. У найбліжэйшы час плануецца распрацаваць мадэльныя законы, якія датычацца штучнага інтэлекту, біялагічнай і кібербяспекі, а таксама абароны электаральнага суверэнітэту.

У размове з журналістамі Ігар Сергяенка адзначыў, што за апошнія пяць гадоў ПА АДКБ прыняла 35 законаў і рэкамендацый. Кіраўнік беларускай дэлегацыі падкрэсліў важнасць таго, каб усе мадэльныя законы, якія прымающа ПА АДКБ, у далейшым знаходзілі адлюстраванне ў нацыянальных заканадаўствах.

**Паводле БелТА і прэс-службы Палаты прадстаўнікоў.**

Магілёўскай — 76,9 %, Мінска — 75,4 %. «Такія высокія паказчыкі прагрэсу пацвярджаюць сур'ёзнасць намераў Беларусі ў дасягненні Мэт устойлівага развіцця. Інфармацыя аб рэгіянальнай ацэнцы дасягненняў МУР дазваляе выявіць кірункі, якія патрабуюць дадатковых намаганняў, характэрных для канкрэтнай тэрыторыі, а таксама вызначыць і адрасна рэагаваць на патрэбы найбольш уразлівых груп насельніцтва», — падагульніў Аляксей Яркавец.

## «РАБОТА БУДЗЕ ПРАЦЯГНУТА Ў ТАКІМ ЖА ПАСЛЯДОЎНЫМ КЛЮЧЫ»

План нацыянальнага каардынатара, які быў падрыхтаваны і прыняты пры ўдзеле Міністэрства замежных спраў, у цэлым выкананы, падкрэсліў у размове з журналістамі Уладзіслаў Татарыновіч. «Сёлета мы ў ініцыятыўным парадку прадставілі трэці нацыянальны агляд Беларусі аб ходзе выканання Мэт устойлівага развіцця. Паводле ацэнак міжнародных экспертаў, у нас дастаткова сур'ёзная становая дынаміка. Прагрэс пацвярджаецца статыстычнымі паказчыкамі. Гэта вынік нашай сумеснай работы. Толькі сумесная работа дазволіць нам і далей паказваць такую добрую станоўчую дынаміку. Што датычыцца наступнага года, будзем працягваць у такім жа паслядоўным ключы», — канкрэтызаваў сенатар.

Ён падкрэсліў: «Наступная пяцігодка і стратэгія ўстойлівага развіцця накіраваны на тое, каб у плане далейшага развіцця эканомікі, фарміравання адпаведнай інфраструктуры, падтрымання стандартаў якаснага жыцця зрабіць усё для таго, каб мы з вамі маглі не толькі жыць і працаваць, але і перайсці на сапраўды больш якасны ўзровень жыцця для кожнага беларуса. А гэта, па сутнасці, наша асноўная задача».

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота БелТА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# СЛОВА — МАЛАДЫМ

## ПАТРЫЯТЫЗМ І АДЗІНСТВА

Як адзначыў **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ**, форум дазволіць выявіць тую частку маладых людзей, якім не ўсё роўна і не абыякава, як будзе развівацца іх краіна. Сюды былі запрошаны найлепшыя з найлепшых: фіналісты праекта «Я патрыёт сваёй краіны», выхаванцы ваенна-патрыятычных клубаў пры сілавых структурах, а таксама пасажыры «Цягніка Памяці».

Гэты праект, дарэчы, працягне аб'ядноўваць маладых людзей краін СНД. Яго ўнікальнасць — у асаблівай атмасферы, бо маршрут удзельнікаў праходзіць па ключавых месцах памяці Вялікай Айчыннай вайны. Як адзначыў Аляксандр Лук'янаў, усіх удзельнікаў праекта аб'ядноўвае ўсведамленне сябе спадкаемцамі Вялікай Перамогі. А гэтае адзінства нараджае нярэдка моцнае сяброўства, якое застаецца паміж маладымі людзьмі і пасля ўдзелу ў праекце.

Удзельніца сёлетняга «Цягніка Памяці» Кацярына Ятусевіч, навучэнка ліцэя Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава, падзялілася першымі ўражаннямі ад мерапрыемства, таксама адзначыўшы важнасць камунікацыі:



«Дыялогавая пляцоўка — гэта важны складнік нашага сённяшняга па-сапраўднаму ўнікальнага форуму. Я рада яшчэ раз сустрэцца з удзельнікамі «Цягніка», з якімі была ў 2025-м, пазнаёміцца з новымі людзьмі, даведацца, як у іх прайшоў «Цягнік памяці», у якіх яшчэ праектах яны паспелі паўдзельнічаць». У наступным, 2026 годзе, ён стане юбілейным — пятым па ліку. За гэты час у ім прымуць удзел каля тысячы чалавек.

## ПРАПАНОВЫ ВІТАЮЦЦА

Хлопцы і дзяўчаты падчас дыялогавай пляцоўкі змаглі абмеркаваць свае ўражанні і планы на будучыню, атрымалі магчымасць паразмаўляць са Старшынёй Савета Рэспублікі, упаўнаважаным прадстаўніком кіраўніка дзяржавы ў горадзе Мінску Наталляй Качанавай і іншымі ганаровымі гасцямі, задалі ім хвалюючыя пытанні.

Напрыклад, удзельніца 2023 года Арына Гатоўчыц, студэнтка другога курса Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, распавяла: «У праекце я вырашыла ўдзельнічаць па расповедах знаёмых хлопцаў і дзяўчат, якія былі ўдзельнікамі першага «Цягніка Памяці». Яны дзяліліся ўражаннямі, і я вельмі натхнілася. Сёння на форуме хацелася б даведацца, які працяг у праекта, ці будуць дадавацца новыя краіны-ўдзельніцы».

Пра гэта пыталіся шмат разоў, прапаноўваючы розныя ідэі і ініцыятывы. Напрыклад, пашырэнне маршрутаў «Цягніка», асабліва ў рэгіёнах. Да таго ж стаць яго пасажырамі марыць нашмат большая колькасць падлеткаў, чым цяпер можна змясціць. А вось удзельнік праекта 2022 года курсант акадэміі МУС Глеб Шыман хацеў агучыць ідэю аб прыцягненні тых, хто ўжо праехаў на «Цягніку»: «Думаю, яны могуць і далей удзельнічаць у праекце, але ўжо як важатыя або суправаджальнікі, дапамаглі б у арганізацыі».

Гаварылі і пра адраджэнне ў рамках «Цягніка Памяці» ўжо амаль забытай традыцыі — адпраўляць адзін аднаму паштоўкі па пошце. На думку ўдзельнікаў дыялогавай пляцоўкі, гэта стала б цікавым і душэўным дапаўненнем да сяброўскіх адносін паміж моладдзю. Кожны, дарэчы, падзяліўся з аўдыторыяй пачуццём гонару ад таго, што атрымалася стаць часткай як форуму, так і «Цягніка Памяці».

На сустрэчы абмяркоўвалі не толькі будучыню праекта, але і ўсёй краіны. Сярод сфер, якія найбольш цікавілі прадстаўнікоў актыўнага маладога пакалення, — адукацыя, маладзёжная палітыка, развіццё навуковага і творчага патэнцыялу Беларусі. Справа ў тым, што шмат хто з удзельнікаў першых маршрутаў «Цягніка Памяці» цяпер ужо студэнты. Будучыя маладыя спецыялісты неаднаразова выказвалі і такую думку: трэба часцей арганізоўваць падобныя мерапрыемствы, у тым ліку збіраць разам выпускнікоў такіх маштабных, доўгачаканых праектаў.

На гэтым мерапрыемствы форуму не скончыліся — у аўторак яго ўдзельнікаў чакаюць у ваеннай часці ва Уруччы, дзе адбудзецца і пленарнае пасяджэнне. Пра гэта мы таксама абавязкова раскажам.

**Аміна НАЗАРАВА.**
**Фота БелТА.**

# РАЗЛІК НА ДЭКОР І ТАКТЫЛЬНАСЦЬ

**Калі мадэрнізацыя аднаго прадпрыемства ўплывае на ўсю айчынную вытворчасць мэблі**

Адно з найстарэйшых прадпрыемстваў Беларусі па дрэваапрацоўцы ААТ «Івацэвічдрэў» запусціла найсучаснейшую лінію ў межах праграмы «Адзін раён — адзін праект». Праца пачалася год таму, і ўжо ёсць канкрэтны вынік. Інавацыйны прадукт прэміяльнай якасці — мэблевыя пліты (паверхня якіх імітуе розныя матэрыялы) — прадстаўлены на рынку. На яго звяртаюць увагу вытворцы мэблі — як буйныя, так і тыя, што працуюць па індывідуальным праекце, — цяпер магчыма рэалізаваць самыя смелыя і арыгінальныя ідэі.

## ДЗЕЛЯ ЖЫЦЦЯЗДОЛЬНАСЦІ

У зале для сустрэч — нешта падобнае на сучасную мастацкую выстаўку, стыльнае і арыгінальнае. А гэта насамрэч узоры новых матэрыялаў, якія прапануюцца для вытворчасці мэблі. Хочаш адчуць навобмацак структуру натуральнага дрэва ў гарнітуры? Альбо мармур ці камень на кухні? Ды нават мяккасць натуральнай скуры ці габелена, напрыклад, на дзверцах шафы... І гэта не ўзоры з дызайнерскіх каталогаў, а рэальнасць, магчымая дзякуючы новай прадукцыі прадпрыемства, якому больш за сто гадоў — неверагодная жыццяздольнасць.

Ужо 53 гады тут вырабляюць драўняна-стружачныя пліты. Гэта адзін з прыкладаў класічнага горадаўтваральнага прадпрыемства. За апошнія некалькі дзесяцігоддзяў яго значнасць узрасла ў межах рэспублікі, што было падцверджана ўвагай на самым высокім узроўні. Напачатку XXI стагоддзя прадпрыемства перажыло нямала мадэрнізацый: з'явілася сучасная лінія ламініравання драўняна-стружачных пліт, затым новыя цэхі па вытворчасці ДСП і ЛДСП — у 2012 годзе гэта быў адзіны прыклад паспяховай рэалізацыі інвестпраектаў у дрэваапрацоўчай галіне. Так на «Івацэвічдрэў» пачалі вырабляць ДСП з дапамогай прэса бесперапыннага дзеяння, што дазволіла выпускаць вялікую пліту, якую можна наразаць. Дзякуючы гэтай вытворчасці развівалася і мэблевая галіна Беларусі: «Пінскдрэў», брэсцкі «Анрэкс» і іншыя прадпрыемствы працуюць у тым ліку па індывідуальных заказах.

У пэўны момант стала відавочна: стандартных матэрыялаў для вытворчасці базавай мэблі недастаткова — звычайнай ДСП, ламініраванай ДСП ці МДФ ужо нікога не здзівіш. Спецыялісты прадпрыемства прааналізавалі рынак, паглядзелі, што можна рабіць на падобным абсталяванні з айчыннай сыравіны, і зразумелі: варта асвоіць выпуск прэміяльных пліт з тэрмаструктураванай паверхняй. Перспектыва ёсць — «мэблевікам» не трэба будзе іх завозіць з-за мяжы са складанай лагістыкай ды рознымі перашкодамі. І галоўнае: гэта зробіць выніковы прадукт — набор мэблі ці асобны прадмет — больш даступным па цане.



— Наша прадпрыемства — першае ў Беларусі наладзіла вытворчасць мэблевых пліт прэміяльнай якасці — з рэльефнай паверхняй і зусім іншым тактыльным успрыманнем, — адзначае **Аляксандр ШЧУРКО, намеснік генеральнага дырэктара па продажах і маркетынгу**. — У рэалізацыі гэтага інавацыйнага праекта была істотная падтрымка на ўзроўні Брэсцкай вобласці ў межах праграмы «Адзін раён — адзін праект», якая дазволіла атрымаць патрэбнае фінансаванне. Новую вытворчую лінію пачалі асвойваць у канцы 2025 года, запусцілі своечасова. І яна ўжо апраўдвае чаканні.

— Прадпрыемства «Івацэвічдрэў» забяспечвае больш за 700 рабочых месцаў на рынку працы. На новую лінію перайшлі самыя вопытная супрацоўнікі, удалося прыцягнуць і высокакласных спецыялістаў, якія мелі досвед працы на мэблевых прадпрыемствах, — адзначае **Таццяна ДЫЛЬКО, намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце.** — Гэта вялікая адказнасць, таму што праект даволі нам заставацца адным з вядучых прадпрыемстваў у дрэваапрацоўчай галіне краіны.



**Генеральны дырэктар прадпрыемства Аляксандр ІЛЬНІЦКІ** неаднойчы падкрэсліваў: каб захаваць канкурэнтаздольнасць, трэба рабіць новыя крокі. Гэта значыць, трэба знаходзіць магчымасці зарабіць грошы, што дазволіць забяспечыць годны заробак людзям і развівацца далей нават у няпростых умовах, калі даводзіцца пераарыентоўвацца на іншыя рынкі — усходнія.

## У ТРЭНДЗЕ

Толькі за некалькі месяцаў 2025 года прадстаўнікі акцыянернага таварыства правялі больш за 20 прэзентацый у розных гарадах Беларусі і за яе межамі, расказалі пра якасныя характарыстыкі і магчымасці выкарыстання новых прэміяльных пліт.

— Ведаеце, што асабліва радуе? Пасля прэзентацый і сустрэч да нас падыходзяць айчынныя «мэблевікі», здзіўляюцца і дзякуюць, што цяпер могуць з гонарам рабіць і прадаваць сваё, беларускае. Аказваецца, гэта вельмі дапамагае ў прыхільнасці да прадукцыі, — удакладняе Аляксандр Шчурко. — Прычым, не толькі ў нашай краіне давяраюць беларускай якасці. А што да нашых прэміяльных пліт, то дагэтуль нічога падобнага не існавала наогул на постсавецкай прасторы!

# «АЛІЎЕ» З АЙЧЫННЫМ

**Паглядзелі, як робіцца кансервацыя для самых**

Хутка Новы год, і без традыцыйнага «Аліўе» на святочным стале яшчэ ніводная гаспадыня не абыходзілася. Таксама надзвычай папулярная салата з крабавымі палачкамі. Напярэдадні свята мы вырашылі паназіраць, як робяць кансерваваныя інгрэдыенты для гэтых папулярных салатаў на кансервавым заводзе ў Быхаве. Некалькі гадоў таму прадпрыемства перажыло мадэрнізацыю і цяпер набірае абароты. Нездарма рэспубліканскі навукова-практычны семінар па перспектывах развіцця кансервавай галіны правялі сёлета менавіта ў Быхаве.

Цікава было даведацца, што той жа гарох часткова вырошчваецца прадпрыемствам на палетках пад Быхавам. Завод арандуе плошчы і пакрысе іх пашырае. Для ўборкі ёсць два гарохаўборачныя камбайны. Сёлетні ўраджай усіх парадаваў.

**Начальнік транспартнага ўчастка і выконваючы абавязкі агранома Сяргей ДЗЯЧЭНКА** расказаў, што на 750 гектарах сабрана 2530 тон гароху.

— Год быў крышку цяжкаваты: халодная вясна, замаразкі, — але мы справіліся з пастаўленай задачай, — кажа ён. — Павялічылі валавы збор да мінулага года недзе на 25 %. Якасць гароху — на самым высокім узроўні. Яе мы можам кантраляваць, пачынаючы з поля.

Для карэспандэнта «Звязды» арганізавалі экскурсію на вытворчыя пляцоўкі. У гэты дзень тут выраблялі інгрэдыент для яшчэ адной папулярнай у беларусаў салаты з крабавымі палачкамі — кукурузу. Яе ў нашых шыротах для кансервацы не вырошчваюць, але якасць кантралюецца вельмі дбайна.

— Гэта хуткازамарожаная сыравіна, паступае да нас з Індыі, — удакладніла **начальнік вытворчай лабараторыі Таццяна АЛІФЕРЧЫК.** — Уся сыравіна і дакументы на яе праходзяць уваходны кантроль. На кожны від свае нарматыўныя паказчыкі. Калі яны не адпавядаюць патрабаванням, сыравіна вяртаецца пастаўшчыку. Распрацоўваем новыя віды прадукцыі, але галоўным чынам удасканальваем тое, што ёсць у нас, не губляем сваю гандлёвую марку, стараемся трымаць статус, таму і кантроль сур'ёзны на ўсіх этапах вытворчасці: ад поля да спажыўца. Гатовая прадукцыя правяраецца на якасць і бяспеку ў Магілёўскім абласным Цэнтры гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, абласным Цэнтры стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі, а некаторыя прадукты — нават у Нацыянальнай акадэміі навук.

Аб'ёмы ўражваюць. Напрыклад, гарошку тут вырабляецца да 200 тысяч слоікаў за дзень — на навагодні стол дакладна хопіць усім. А расольніку, які гатуецца з некалькіх кампанентаў, — 35 тысяч слоікаў.

У рабоце задзейнічана абсталяванне вядомых вытворцаў, якое, па словах Таццяны Аліферчык, пастаянна абнаўляецца. Стэрылізацыя адбываецца ў вялікіх аўтаклавах, куды заганя-









Новую прадукцыю «Івацэвічдрэў» ужо ацанілі ў Расіі і Казахстане. Нядаўна холдынг прадстаўляў яе ў Маскве на буйной мэблевай выстаўцы краін СНД. Але ёсць і нечаканы вынік: напрыклад, партнёры з Краснаярска ў першую чаргу зацікаўлены ў прэміяльных плітах, але паралельна працуюць і са звычайным ДСП, ЛДСП гэтай вытворчасці. І ў іншых рэгіёнах назіраецца такі ж падыход. Праект аказаўся паспяховы не толькі сам па сабе, але яшчэ стаў правадніком звычайнай прадукцыі на рынкі, што некалі былі недаступныя з-за складанай лагістыкі ці з-за таго, што беларусы раней не прапаноўвалі таго, чаго там не было.

— Мы змаглі дабіцца высокай якасці новых пліт на аснове ДСП, бо за апошнія 53 гады працы дасягнулі высокай кампетэнцыі, — кажа Аляксандр Шчурко. — У нас вытворчасць замкнёнага цыклу: сюды прывозяць лес, а мы самі робім дранку, самі варым смалу, прапітваем паперу і ламініруем... Мы лічым гэта сваёй перавагай. І ад такога матэрыялу не адмаўляемся. Добра наладжаная вытворчасць дазволіла выпусціць патрэбную аснову, на якой можна зрабіць суперглыбокія цісненні, заламінаваць пластык, а не плёнку. Мы вырабляем ДСП павялічанай шчыльнасці, што па характарыстыках не саступае аснове МДФ, больш шчыльнаму і цяжкому матэрыялу, які складана апрацоўваць. А з ДСП працаваць значна прасцей, лёгка змантаваць. Мэбля з яго будзе доўга служыць, ён не рассохнецца і не страціць сваю геаметрыю. У адрозненне ад натуральных матэрыялаў ён недарагі, а гэта ўплывае на кошт мэблі. І яшчэ адну істотную праблему вырашаем: імпартазамяшчэння. У гэтым кірунку працуем над вытворчасцю кухонных стальніц, якія ў Беларусі не вырабляліся ў дастатковай колькасці і завозіліся ў асноўным з еўрапейскіх краін. Напаўняем рынак айчынным, а таму больш танным і даступным матэрыялам, які не саступае імпартным па якасных характарыстыках.

Яшчэ адзін істотны паказчык — экалагічнасць. Як кажуць, «фішка» прадпрыемства яшчэ з тых часоў, калі яго прадукцыя пастаўлялася на еўрапейскі рынак згодна з іх высокімі стандартамі. І цяпер «Івацэвічдрэў» працягвае штогод праходзіць сертыфікацыю ў адной еўрапейскай лабараторыі, што мае значэнне для партнёраў і спажыўцоў, якія дбаюць пра бясшкоднае паветра ў доме. Паводле статыстыкі, корпусная мэбля, вырабленая ў Беларусі, на 70 % — з пліт «Івацэвічдрэў». У кожнай вобласці нашай рэспублікі ёсць прадстаўнікі прадпрыемства, якія дэманструюць вытворцам мэблі, што беларускія матэрыялы — гэта самы трэнд. Таму галоўны вынік інавацыйнага праекта ў тым, што з'явіўся прадукт, па якім ацэньваюць не асобную кампанію, а ўсю беларускую дрэваапрацоўку і мэблевую прамысловасць.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**
**Фота аўтара і з архіва прадпрыемства.**

# СМАКАМ
## папулярных навагодніх салатаў













юцца цэлыя партыі прадукцыі. Запускаецца спецыяльная праграма, і пачынаецца працэс. Пасля гэтага кансервы адпраўляюцца на склад, дзе 11 дзён выстойваюцца. Потым зноў праводзяцца лабараторныя выпрабаванні — на прадмет якасці і герметычнасці. Калі ўсё ў норме, слоікі адпраўляюцца на аблейку і пакуюцца ў плёнку.

На прадпрыемстве працуе 240 чалавек, сёлета створана каля 40 новых працоўных месцаў.

— Людзей нават не хапае, прывозім з Доўска, — удакладняе **дырэктар ТАА «Быхаўскі кансервавы завод» Аюб АБДУЛМУСЛІМАЎ.** — Аб'ёмы растуць, кантракты ў нас заключаны да вясны. Акцэнт робім на айчыннай сыравіне. Прапрацоўваем пытанне па вырошчванні некалькіх відаў сартоў гарбуза, будзем эксперыментаваць, рабіць маркоўныя нектары, пюрэ — шмат прадукцыі, запатрабаванай на рынку. Ёсць планы развіць асартымент, які будзе заснаваны на мясцовай сыравіне. Заклікаем мясцовых фермераў вырошчваць для завода прадукцыю. І бачым тэндэнцыю, што з года ў год усё больш людзей уцягваецца ў гэты працэс: і сялянскія фермерскія гаспадаркі, і асабістыя падсобныя гаспадаркі, і школы.

Большасць прадукцыі пастаўляецца ў Расію, краіны Мытнага саюза. А сёлета, напрыклад, на прадпрыемстве пабывалі прадстаўнікі з Кітая, узялі на пробу невялікую партыю бярозавага соку і карнішонаў.

— Дзякуючы кіраўніцтву краіны і раёна прадпрыемства развіваецца, — адзначае Аюб Абдулмуслімаў. — Інвестар не стаў мяняць прызначэнне завода і развівае вытворчасць у кірунку кансервацыі. Разам з ім мы гэта ўсё адраджаем, і патэнцыял вялікі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота БелТА.**
*г. Быхаў.*

БЕЛМЫТСЭРВІС

**7 снежня брэсцкі філіял адзначыў свой дзень нараджэння**



Дырэктар Віталь БАЛДОЎСКІ.





Перш чым заехаць у зону часовай стаянкі грузавікоў, на КПП правяраюцца ўсе дакументы.

УНП 101561144

# ЗАХОДНІЯ ВАРОТЫ ЕАЭС

Так, без перабольшання, называюць сёння самы заходні філіял РУП «Белмытсэрвіс» — брэсцкі. У 2022 годзе, разам з двума ўжо дзеючымі ТЛЦ, быў уведзены ў эксплуатацыю мультымадальны транспартна-лагістычны цэнтр «Брэст-Белмытсэрвіс — 3», які даў прадпрыемству новы імпульс да далейшага развіцця. Тэрмінал мае стратэгічна важнае значэнне ў лагістыцы Еўразійскага эканамічнага саюза. Пра тое, якім калектыў філіяла бачыць сваю будучыню, як спраўляецца з пастаўленымі задачамі і ўскладзенымі на яго важнымі функцыямі, наша размова з дырэктарам Віталіем БАЛДОЎСКІМ.

## НА НОВЫМ ШАЎКОВЫМ ШЛЯХУ

— Брэсцкі філіял сапраўды выконвае ролю найважнейшых заходніх варот ЕАЭС — гэта «разумны шлюз», які забяспечвае бяспеку эканамічнай прасторы ЕАЭС. Мы спалучаем высокую прапускную здольнасць з эфектыўным кантролем, выкарыстоўваючы тэхналогіі рызыка-менеджменту, каб не дапускаць парушэнняў і забяспечваць законнасць перасячэння граніцы. Праз РПТА «Казловічы» — адзін з найбуйнейшых грузавых тэрміналаў на постсавецкай прасторы — праходзяць асноўны рух грузавых транспартных сродкаў. Штодня прапускаем да тысячы грузавікоў у абодвух напрамках. А ў транспартна-лагістычным цэнтры «Брэст-Белмытсэрвіс — 3» рэалізавана ўнікальная перавага Беларускай транспартнай сістэмы — наяўнасць шырокіх і вузкіх фарматаў чыгуначнай каляіны.

Тут, па словах Віталія Аляксеевіча, створана і будзе развівацца інфраструктура, якая дазволіць РУП «Белмытсэрвіс» інвеставаць у новы Шаўковы шлях і іншыя перспектыўныя лагістычныя праекты.

— Работа нашага філіяла сёння — гэта суадносіны выклікаў і магчымасцяў. З аднаго боку, мы сутыкаемся з нерытмічнай работай нашых суседзяў, з другога — актыўна дыверсіфікуем патокі і развіваем інфраструктуру, як гэта відаць на прыкладзе будаўніцтва новых зон чакання, — адзначыў ён.

## АФРЫКА, АЗІЯ І БЛІЗКІ УСХОД

**— Як на работу філіяла паўплывала геапалітычная сітуацыя ў цэлым і санкцыі ў прыватнасці, якія шляхі і напрамкі падказала?** — задаём кіраўніку яшчэ адно актуальнае пытанне і просім расказаць аб асноўных кірунках сённяшняй дзейнасці аднаго з вядучых падраздзяленняў «Белмытсэрвіс».

— Наша дзейнасць характарызуецца выключнай шырынёй і дыверсіфікацыяй, — расказвае Віталій Балдоўскі. — Сёння мы рэалізоўваем 8 асноўных напрамкаў, прапаноўваючы кліентам больш за 20 спецыялізаваных паслуг: ад класічнага мытнага афармлення да складской лагістыкі, ЗЭД-кансалтынгу, маніторынгу навігацыйных прылад, сэрвіснага абслугоўвання і рознічнага гандлю.

Кіраўнік падкрэслівае, што геапалітычная сітуацыя стала каталізатарам глыбокай перабудовы лагістычных ланцужкоў. І Брэсцкі філіял, як флагман Нацыянальнага лагістычнага аператара, актыўна ўдзельнічае ў гэтым працэсе.

— Калі раней фокус быў на заходнім напрамку, — канстатуе ён, — то сёння фарміруем альтэрнатыўныя маршруты. Ключавымі для нас сталі Кітай, краіны Афрыкі (Алжыр, Егіпет, ЮАР), Сярэдняй Азіі (Узбекістан, Казахстан) і Блізкага Усходу. Актыўна развіваем мультымадальныя перавозкі, уключаючы выкарыстанне Паўночнага марскога шляху.

## БОЛЬШ ЗА ДВА МІЛЬЁНЫ НАВІГАЦЫЙНЫХ ПЛОМБ

Сёння зноў на грэбені актуальнасці — устаноўка навігацыйных пломб. Пакуль яшчэ ідзе падрыхтоўчая работа, але з наступнага года іх укараняць на ўсёй тэрыторыі ЕАЭС. Эксперты адзначаюць, што ў гэтым працэсе дапамагае каласальны вопыт Беларусі.

— І Брэсцкі філіял з пачатку рэалізацыі механізму адсочвання транзітных перавозак у гэтым пытанні назапасіў велізарны досвед, — кажа Віталій Балдоўскі. — Нашымі спецыялістамі ўжо пераадолены двухмільённы рубеж прымянення навігацыйных пломб. Гэта дазваляе неадкладна рэагаваць на любыя праблемы, якія ўзнікаюць, і забяспечваць кліентам поўны спектр паслуг: ад накладання пломбаў да маніторынгу перамяшчэння грузаў.

Са студзеня 2025 года працуем у рамках адзінага механізма з расійскім аператарам, створаны аператыўны штаб — жывы прыклад, як павінна працаваць «бясшвовая» сістэма на прасторы Саюза. Паспяховы вопыт Беларусі і Расіі па ўжыванні навігацыйных пломбаў пры перавозцы грузаў будзе выкарыстаны для ўкаранення на ўсёй тэрыторыі ЕАЭС у наступным годзе.



Спецыялісты аддзела мытнага дэкларавання.





На найбуйнейшай у Еўропе зоне чакання для грузавікоў, разлічанай на 800 машына–месцаў, завяршаюцца будаўнічыя работы.





Для міжнародных аўтамабільных перавозчыкаў на брэсцкім філіяле ёсць усе ўмовы для камфортнага знаходжання, у тым ліку і гасцініца.

## НА ЯКАСНА НОВЫМ УЗРОЎНІ

Пад Брэстам завяршаецца будаўніцтва дзвюх зон чакання — для вадзіцеляў-міжнароднікаў і турыстаў. Мы папрасілі дырэктара філіяла расказаць, як усё будзе выглядаць, якія прадугледжаны сэрвісы і паслугі для кліентаў філіяла, гасцей нашай краіны.

— Будаўніцтва дзвюх новых зон чакання — гэта якасна новы ўзровень сэрвісу для ўсіх, хто перасякае нашу граніцу. Каля пункта пропуску «Казловічы» ствараецца найбуйнейшая ў Еўропе зона чакання для грузавікоў, — расказвае Віталій Балдоўскі. — Праект знаходзіцца на завяршальнай стадыі. Узведзены шматфункцыянальны будынак плошчай больш за 600 м$^2$ і паркоўка на 800 стаяначных месцаў. Завершаны работы па ўкладцы інжынерных сетак, у шматфункцыянальным комплексе вядуцца фінальныя ўнутраныя аддзелачныя работы. У будынку прадугледжаны ўсе неабходныя ўмовы для камфортнага чакання: кафэ на 30 пасадачных месцаў, санітарныя блокі з душавымі кабінамі і зона з тэхнікай для мыцця і прасавання. У комплексе знаходзяцца таксама цэх для гатавання ежы, кандытарская, складскія памяшканні. Побач з «Варшаўскім мостам» будуецца зона чакання на 280 месцаў для легкавых аўтамабіляў і аўтобусаў. Гэта будуць не проста стаянкі, а шматфункцыянальныя комплексы з кругласутачнымі кафэ, душавымі, пральнямі, зонамі адпачынку і аб'ектамі прыдарожнага сэрвісу. Такая сучасная сэрвісная экасістэма дазволіць ліквідаваць стыхійныя заторы, павысіць транзітную прывабнасць Рэспублікі Беларусь.

## ГЛЯДЗІМ У БУДУЧЫНЮ

**— Якія сучасныя сродкі — тэхнічныя і тэхналагічныя — прымяняе ў сваёй рабоце філіял?**

— Лічбавая трансфармацыя — аснова нашай аперацыйнай дзейнасці, — адказвае кіраўнік філіяла. — Са жніўня 2024 года ў структуры РУП «Белмытсэрвіс» працуе офіс лічбавізацыі, які каардынуе гэтыя пытанні. Выкарыстоўваем праграмнае забеспячэнне ўласнай распрацоўкі для адпраўкі электронных мытных дакументаў, маніторынгу грузаперавозак і арганізацыі электроннай чаргі.

У будучыні, па словах Віталія Аляксеевіча, плануецца развіваць такія праекты, як далейшае развіццё вобласці сэрвісаў і аналітыкі вялікіх даных для прагназавання лагістычных патокаў і аптымізацыі работы.

— Акрамя лічбавай трансфармацыі, робім сур'ёзныя інвестыцыі ў матэрыяльна-тэхнічную базу, — працягнуў ён. — У зоне нашай дзейнасці ўжо паспяхова функцыянуюць транспартна-лагістычныя цэнтры класа «А», якія адпавядаюць самым высокім міжнародным стандартам па аснашчэнні, бяспецы і ўзроўні сэрвісу.

І гэта яшчэ не ўсё. Ужо ў наступным годзе тут уводзіць у эксплуатацыю кантэйнерную пляцоўку з унікальнай для рэгіёна характарыстыкай — яна будзе абсталявана пад'язнымі шляхамі з вузкай і шырокай каляінамі.

— Мы зможам максімальна гібка і эфектыўна абслугоўваць чыгуначныя патокі з розных напрамкаў, — кажа дырэктар філіяла. — Пляцоўка будзе ўкамплектавана сучаснай спецтэхнікай, такой як рычстакеры і іншай, якая дапаможа забяспечыць высакахуткасную і бяспечную апрацоўку грузаў.

## КАМАНДА ПРАФЕСІЯНАЛАЎ

Брэсцкі філіял «Белмытсэрвісу» ўстойліва займае адну з лідарскіх пазіцый як на прадпрыемстве, так і ў рэгіёне. Калі мы папрасілі Віталія Аляксеевіча назваць галоўныя канкурэнтныя перавагі прадпрыемства, ён не задумваючыся адказаў:

— Нашы канкурэнтныя перавагі — гэта маштабная інфраструктура, комплекснасць паслуг і арыентацыя на інавацыі. Цеснае ўзаемадзеянне з дзяржаўнымі органамі і статус нацыянальнага аператара — усё гэта дае нам глыбокае разуменне рэгуляторыкі і дазваляе прапаноўваць кліентам аптымальныя рашэнні.

Адным з асноўных фактараў поспеху Віталій Балдоўскі назваў згуртаваны і высокапрафесійны калектыў.

— Я ганаруся камандай прафесіяналаў нашага філіяла, якая па выніках работы неаднаразова займала лідарскія пазіцыі і адзначалася ўзнагародамі РУП «Белмытсэрвіс». Гэта даказвае, што нашы супрацоўнікі — не проста выканаўцы, а сапраўдныя асы, здольныя эфектыўна вырашаць складаныя задачы, — падсумаваў кіраўнік.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

# ЗА КОШТ ЧАГО?

## Аналітыкі ЕАБР назвалі прычыну росту ЗВР Беларусі

Золатавалютныя рэзервы нашай краіны зноў падраслі. На гэта звяртаюць увагу аналітыкі Еўразійскага банка развіцця ў сваім штотыднёвым макраэканамічным аглядзе.



Так, паводле звестак за лістапад, яны выраслі на 180 мільёнаў долараў за месяц і дасягнулі 13,9 мільярда долараў на пачатак снежня.

— Асноўным фактарам стала падаражанне золата на сусветных рынках (+4,1 % месяц да месяца), што павялічыла яго кошт у рэзервах на 0,31 мільярда долараў, — адзначылі аналітыкі банка.

Пры гэтым яны звярнулі ўвагу на тое, што актывы ў замежнай валюце скараціліся на 0,1 мільярда долараў. З пачатку года рэзервы выраслі больш чым у 1,5 раза, або на 5 мільярдаў долараў.

— З верасня 2025 года аб'ём рэзерваў адпавядае міжнароднаму крытэрыю бяспекі — пакрывае трохмесячны аб'ём імпарту, — падкрэслілі ў ЕАБР.

# РОСТ ПАД КАНТРОЛЕМ

## Прыняцце рашэнняў урада аб змяненні цэнавага рэгулявання суправаджаецца штодзённым кантролем цэн



Аўтаматызаваная сістэма кантролю цэн, распрацаваная МПЗ, дазваляе збіраць такія даныя і аператыўна рэагаваць на завышэнне цэн, паведамілі ў прэс-службе ўрада.

Эфектыўнасць прыняцця рашэнняў забяспечвае інфармацыя аб цэнах па 103 таварных групах з больш чым 110 тысяч гандлёвых аб'ектаў. Гэты спіс пастаянна пашыраецца, дадалі ў Саўміне.

**Міністр па падатках і зборах Дзмітрый КІЙКО** растлумачыў:

— Міністэрствам падаткаў і збораў рэалізаваны дадатковы інфармацыйны комплекс на базе сістэмы кантролю сістэмы касавага абсталявання. Комплекс дазваляе працаваць аператыўна, сёння ён настроены на аналіз штотыднёвага змянення ўзроўню цэн, змянення ўзроўню цэн з пачатку месяца, з пачатку года. Пры неабходнасці комплекс нават можа быць настроены на штодзённы маніторынг змянення ўзроўню цэн.

# НАШ КАРАВАЙ

## Збожжавыя і зернебабовыя культуры з кукурузай убраны амаль са 100 % плошчаў

Паводле аператыўных звестак на 8 снежня, з палёў краіны намалочана 11 мільёнаў 144 тысячы тон збожжа разам з рапсам і кукурузай.

Як паведамілі ў Мінсельгасхарчы, у разрэзе абласцей уклад выглядае наступным чынам: Брэсцкая — 2,219 мільёна тон, Віцебская — 1,079, Гомельская — 1,454, Гродзенская — 2,199, Мінская — 2,787 і Магілёўская — 1,406 мільёна тон.

У профільным ведамстве дадалі, што збожжавыя і зернебабовыя культуры з кукурузай убраны амаль са 100 % плошчаў, што складае 2,282 мільёна гектараў.

Цукровых буракоў накапана 6 мільёнаў 115 тысяч тон караняплода. На буракапрыёмныя пункты вывезена 93 % ад накапанага, што складае 5 мільёнаў 656 тысяч тон.

Паднята зябліва на плошчы 1 мільён 510 тысяч гектараў, што складае 105 % да плана.

Назапашана мінеральных угнаенняў у чацвёртым квартале 2025 года пад зяблевую апрацоўку бягучага года і яравую сяўбу 2026 года 204 тысячы тон дзеючага рэчыва, што складае 63 % да плана.

Раскрыжоўка садоў праведзена на плошчы 2 мільёны 459 тысяч гектараў, што складае 140 % да плана.



# ПАДТРЫМКА СВАЙГО

## Каля 800 суб'ектаў далучыліся да сістэмнага пагаднення па падтрымцы айчынных вытворцаў

Як нагадалі ў прэс-службе МАРГ, з красавіка 2025 года дзейнічае пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне павышэння эфектыўнасці продажаў тавараў айчыннай вытворчасці.

Родныя тавары

На сёння ў ім удзельнічае ўжо каля 800 суб'ектаў. Сярод новых удзельнікаў — гандлёвыя сеткі «Санта», «Суседзі», «Алмі», «Еўраопт», «Вожык», «Сем пятніц», «Unistore», «Белмаркет», «Гандлёвы дом АТЛАНТ», «Кірмаш», а таксама вытворцы, такія як Мінскі завод пеністых він, H-TV, «Віцебскэнерга», Полацкі камбікормавы завод і іншыя.

Пры ўдзеле ўпраўлення гандлю і паслуг Брэсцкага, Віцебскага, Гомельскага, Гродзенскага і Магілёўскага аблвыканкамаў прайшлі семінары-нарады па павышэнні эфектыўнасці продажаў айчынных тавараў. У мерапрыемствах удзельнічалі прадстаўнікі мясцовых выканаўчых камітэтаў, гандлю і вытворцаў, што спрыяла аб'яднанню намаганняў у сумеснай рабоце.

А як сёння прапаноўваюцца нашы тавары?

У гандлёвых залах выкарыстоўваюць візуальнае вылучэнне і інтэграцыю знакаў адрознення: «Родныя тавары», «Зроблена ў Беларусі», «Купляйце беларускае», «Купляйце найлепшае», «Купляйце сваё», «Дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь», «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь». Таксама ствараюцца брэндзоны і фірменныя секцыі, вылучаюцца тавары ў акцыйных буклетах, улётках.

А што вытворцы?

Не стаяць на месцы і выпускаюць новыя прадукты, распрацоўваюць крэатыўныя дызайны, навінкі з незвычайнымі смакамі, ствараюць сумесныя праекты, напрыклад, напой «Бела-кола» і зефір «Першы Бабруйскі», зубная паста «Modum» і «Камунарка», футболкі ад MUA Shop і JATTIS, марожанае эскімо ад Мінскага халадакамбіната № 2 і «Камунарка» і іншыя праекты. А таксама размяшчаюць рэкламу на транспарце, праводзяць рэкламныя гульні і розыгрышы прызоў.

— Адначасова абедзвюма бакамі праводзіцца комплексная работа са СМІ, блогерамі, ствараецца эксклюзіўны кантэнт у сацыяльных сетках. Усе меры накіраваны на прасоўванне айчынных тавараў, — падкрэслілі ў профільным міністэрстве.

# РАЗАМ ДА АГУЛЬНАЙ МЭТЫ

## БУТБ і Цэнтр падтрымкі экспарту Башкартастана падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве

Беларуская ўніверсальная таварная біржа і Цэнтр падтрымкі экспарту Рэспублікі Башкартастан замацавалі свае намеры аб выбудоўванні доўгатэрміновага ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва ў сферы біржавога гандлю шляхам падпісання адпаведнага пагаднення, паведамілі ў прэс-службе БУТБ.

Цырымонія адбылася ў рамках міжнароднага Тыдня бізнесу, які прайшоў ва Уфе на мінулым тыдні. З боку БУТБ подпіс на дакуменце паставіў **начальнік упраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці біржы Яраслаў КАВАЛЬЧУК,** а з боку ЦПЭ — **дырэктар дадзенай арганізацыі Таццяна ІЗОТАВА.** Плануецца, што работа па рэалізацыі асноўных кірункаў узаемадзеяння, указаных у пагадненні, пачнецца ў найбліжэйшы час, каб ужо да канца бягучага года выйсці на яшчэ больш высокія паказчыкі біржавога тавараабароту паміж Беларуссю і Башкартастанам.

— Па выніках 11 месяцаў сума біржавых здзелак удзельнікаў таргоў з Башкартастана перавысіла 5,4 мільёна долараў, што ў два разы больш, чым за такі ж перыяд мінулага года. Ільвіная доля тавараабароту прыйшлася на пастаўкі ў Башкартастан беларускага сухога малака, сметанковага масла, мясапрадуктаў і піламатэрыялаў. Па імпарце закупляліся толькі невялікія аб'ёмы вырабаў з чорных металаў, — расказаў начальнік упраўлення ЗЭД БУТБ Яраслаў Кавальчук. — У сувязі з гэтым адна з ключавых мэт пагаднення аб супрацоўніцтве з рэгіянальным цэнтрам экспарту — прыцягнуць на біржавую пляцоўку башкартастанскіх таваравытворцаў для рэалізацыі іх прадукцыі ў секцыі «прамысловыя і спажывецкія тавары».



Гэты сегмент біржавога рынку ідэальна падыходзіць для суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, зацікаўленых у арганізацыі збыту за мяжой, дазваляючы ім выкарыстоўваць лічбавую інфраструктуру біржы як альтэрнатыву традыцыйнай тавараправоднай сеткі.

У тым, што калабарацыя БУТБ і ЦПЭ Башкартастана станоўча адаб'ецца на дынаміцы аб'ёмаў біржавога гандлю Беларусі і рэгіёна ўпэўнена і Таццяна Ізотава. Паводле яе слоў, біржа дае прадпрымальнікам цэлы шэраг інструментаў, якія спрашчаюць работу на знешнім рынку і якія робяць яе значна больш эфектыўнай.

— Нікольк не сумняваюся, што біржа адкрые новыя магчымасці для малога і сярэдняга бізнесу Башкартастана не толькі па рэалізацыі, але і па закупках тавараў у Беларусі. Асабліва гэта датычыцца вытворцаў імпартазамяшчальнай прадукцыі, якія хацелі б пастаўляць свае тавары беларускім спажыўцам, а таксама набываць сыравіну і камплектуючыя ў рамках праектаў прамысловай кааперацыі. Лічу, што ў гэтых адносінах у нас сапраўды шырокае поле для ўзаемадзеяння, — падкрэсліла дырэктар ЦПЭ Башкартастана.

Дарэчы, па стане на 5 снежня бягучага года на БУТБ былі акрэдытаваны 33 удзельнікі біржавых таргоў з Башкартастана. Гэта на пяць больш, чым у пачатку года.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (организатор аукциона) по поручению **открытого акционерного общества «Слуцкая фабрика пошива одежды»** (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже **одним лотом имущества в составе:**

- **изолированное помещение с инв. № 640/D-50250 (наименование – гараж) общ. пл. 23,4 кв. м, адрес: г. Слуцк, ул. Уласовца, 3Б/1-2;**
- **изолированное помещение с инв. № 640/D-50251 (наименование – склад с бытовым помещением), общ. пл. 265,1 кв. м, адрес: г. Слуцк, ул. Уласовца, 3Б/1-1;**
- **изолированное помещение с инв. № 640/D-50249 (наименование – склад), общ. пл. 65,1 кв. м, адрес: г. Слуцк, ул. Уласовца, 3Б/1-4;**
- **капитальное строение с инв. № 640/С-27199 (наименование – швейно-массовый цех)** *(составные части и принадлежности: 4 пристройки, уборная)*, **общ. пл. 880,0 кв. м, адрес: г. Слуцк, ул. Уласовца, 3Б/3;**
- **капитальное строение с инв. № 640/С-27204 (наименование – проходная), общ. пл. 9,0 кв. м, адрес: г. Слуцк, ул. Уласовца, 3Б;**
- **капитальное строение с инв. № 640/С-114516 (наименование – гараж), общ. пл. 108,1 кв. м, адрес: г. Слуцк, ул. Уласовца, 3Б/2.**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 624650100001000065** ***(право аренды по 07.04.2041)*** **площадью 0,7264 га по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Уласовца, 3Б.**

*Земельный участок имеет ограничения прав: охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения, 0,0832 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 79 828,92** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 7 982,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 60 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает продавцу затраты на публикацию извещения о проведении аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 04.06.2025, 28.08.2025.

Аукцион состоится **23.12.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.12.2025** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: (801795) 6-36-00, (8029) 370-56-01.**

УНН 600154407

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (организатор аукциона) по поручению **ОАО «Солигорскводстрой»** (продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:

- **хозяйственный сарай с инв. № 643/С-16943 общей площадью 37,1 кв. м, адрес: Минская обл., Любанский р-н, г. Любань, ул. Боровика, 46П;**
- **склад материалов с инв. № 643/С-16333 общей площадью 609,5 кв. м, адрес: Минская обл., Любанский р-н, г. Любань, ул. Боровика, 46П/1;**
- **склад кирпичный под цемент с инв. № 643/С-14760 общей площадью 349,3 кв. м, адрес: Минская обл., Любанский р-н, г. Любань, ул. Боровика, 46П/2 (далее – Объекты).**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 623450100001003383 площадью 0,7788 га** *(право аренды по 03.09.2075)* **по адресу: Минская область, г. Любань, ул. Боровика, 46П.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 178 920,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 17 892,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **09.01.2026** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **06.01.2026** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: (8029) 189-18-44.**

Вітражы майстэрства

# ВЫТОКІ САПРАЎДНАГА ПРАФЕСІЯНАЛІЗМУ

## Як установа адукацыі з багатай гісторыяй стварае новыя магчымасці для навучэнцаў

Мінскі дзяржаўны механіка-тэхналагічны каледж у наступным годзе адзначыць 70-гадовы юбілей. Установа адукацыі ўвойдзе ў юбілейны год з новымі спецыяльнасцямі, сучаснымі памяшканнямі і пашыраным узаемадзеяннем з іншымі каледжамі краіны.



### НОВЫЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ І КІРУНКІ ДЛЯ СУЧАСНАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ

Гісторыя каледжа пачыналася з фабрычна-завадской школы пры Мінскім мясакамбінаце. З таго часу адбылося нямала змен і пераўтварэнняў, якія стварылі адну з найбольш тэхналагічна абсталяваных устаноў адукацыі ў сталіцы.

Як адзначае **намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Ганна ДОЎГАЯ**, развіццё каледжа адбывалася паступова і планамерна і



сёння ў каледжы вядзецца падрыхтоўка па вялікай колькасці кірункаў. Гэта блок грамадскага харчавання (кулінары, кандытары, вытворцы мясной прадукцыі), падрыхтоўка слесараў і машыністаў, а таксама наладчыкаў нізкатэмпературнай тэхнікі. У 2024 годзе каледж адкрыў для сябе прынцыпова новую спецыяльнасць — «Апрацоўшчык рыбы і марапрадуктаў».

«Мы адкрылі спецыяльнасць, якая стала вельмі запатрабаванай. На Міншчыне шмат прадпрыемстваў, што займаюцца перапрацоўкай рыбы. Таму мы вырашылі рыхтаваць спецыялістаў для гэтай галіны — повараў і апрацоўшчыкаў рыбы і марапрадуктаў, ідзём у нагу з часам», — падкрэслівае Ганна Доўгая.

Яшчэ адна надзвычай патрэбная спецыяльнасць — апаратчык шырокага профілю ў вытворчасці хіміка-фармацэўтычных прэпаратаў. Выпускнікі працуюць на буйных беларускіх фармпрадпрыемствах: ад «Белмедпрэпаратаў» да «Акадэмфарма».

Не абыходзіць каледж і IT-сферу. Тут рыхтуюць тэхнікаў-праграмістаў, а сёлета ўпершыню сфарміравалі групу аператараў электронна-вылічальнай тэхнікі і наладчыкаў апаратнага ПЗ, у якой навучаюцца і дзеці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

### КАЛЕДЖ ЯК ЦЭНТР КАМПЕТЭНЦЫЙ

Ва ўстанову прыходзяць выпускнікі як 9-х класаў, так і 11-х. «У большай ступені гэта, вядома, дзевяцікласнікі, але ў гэтым годзе вельмі вырас удзел выпускнікоў пасля 11 класа. Асабліва шмат іх у групах повараў і праграмістаў», — адзначае Ганна Доўгая. Усяго ў каледжы навучаецца больш за 1 150 чалавек.

Аднак гэта далёка не ўсе — на яго базе створаны Цэнтр кампетэнцый па наладцы і эксплуатацыі нізкатэмпературнай тэхнікі, які дазваляе арганізоўваць сеткавае навучанне.

«Да нас прыязджаюць вучні з іншых каледжаў, дзе няма такой шырокай матэрыяльна-тэхнічнай базы. Яны праходзяць навучанне ў нас, мы можам прапанаваць абсталяванне, якога часам няма нават на прадпрыемствах», — тлумачыць Ганна Доўгая. Дарэчы, менавіта на базе каледжа адбываюцца гарадскія конкурсы. Так, сёлета пройдзе юбілейны пяты конкурс па наладцы нізкатэмпературнай тэхнікі.

**Андрэй ЗІНОЎЧЫК, загадчык Цэнтра кампетэнцый па наладцы і эксплуатацыі нізкатэмпературнай тэхнікі**, расказвае пра дзейнасць цэнтра так: «Вучым. Павышаем кваліфікацыю. Усім, што звязана з холадазабеспячэннем, мы і займаемся». Ён падкрэслівае, што навучанне тут практычнае: «У іх ёсць схема — электрычная, гідраўлічная. Што і як сабяруць — прастора для творчасці, яны ў нас майстры».

Загадчык цэнтра ўдакладняе, што хоць устаноўкі, на якіх працуюць вучні, новыя, усе яны розныя па прызначэнні. Парадак навучання наступны: спачатку лекцыі па аўтаматызацыі, потым практыка з асаблівай увагай да тэхнікі бяспекі: «Ёсць выкладчык, ёсць прадмет «Ахова працы», экзамен. Без гэтага ні на адно прадпрыемства іх не дапусціць. Жыццё і здароўе дзіцяці — прыярытэт. Жывымі-здаровымі прыйшлі — такімі ж павінны і выйсці».

### ПЕДКАЛЕКТЫЎ — АСНОВА ЯКАСНАЙ АДУКАЦЫІ

Увогуле ж, механіка-тэхналагічны каледж — адна з тых устаноў, дзе пра супрацоўнікаў часта кажуць «свая сям'я». Ганна Доўгая тлумачыць гэта на асабістым прыкладзе: «Я прыйшла сюды працаваць яшчэ на чацвёртым курсе, у 2017 годзе. Думала, што адпрацую па размеркаванні і пайду. Але ўжо амаль восем гадоў тут, вырасла да намесніка дырэктара. Атмасфера — вельмі дружалюбная, працоўная. Калі б было інакш, каледж не змог бы так развівацца». Яна адзначае, што кадравай цякучасці фактычна няма: «Мы выпускаем тэхнікаў, тэхнолагаў, майстроў. Сёлета дзевяць нашых выпускнікоў прыйшлі да нас жа працаваць. Мы іх вучылі — цяпер гэта нашы калегі».

Каледж упэўнена ідзе ў юбілейны год з новымі кірункамі, умацаванай матэрыяльнай базай і моцнай супольнасцю выкладчыкаў і навучэнцаў. Ён застаецца адной з тых устаноў, дзе гісторыя і сучаснасць не супярэчаць адна адной, а ствараюць стабільную аснову для будучыні.

**Міхаіл ДАНІЛКОВІЧ.**
**Фота дадзена каледжам.**



Фота Ксеніі ЛІННІК.

ЛЮДЗІ СПРАВЫ

# ВЕРНАСЦЬ ВЫБРАНАМУ ШЛЯХУ

## На МТЗ ёсць працоўная дынастыя, агульны стаж якой больш за 200 гадоў

Высокая рэпутацыя кожнага прадпрыемства — гэта вынік шматгадовай і самаадданай працы адказных спецыялістаў. Многія работнікі ААТ «Мінскі трактарны завод» працуюць тут не адзін дзясятак гадоў і сталі дастойнымі прадаўжальнікамі сямейных дынастый. Стаж адной з іх, Дзітчанкаў — Шурдзяковых — Высоцкай — Сяўкоўскай, складае больш за 200 гадоў.

### У КАЛЕКТЫВЕ АДНАДУМЦАЎ

**Таццяна Віктараўна Шурдзякова** працуе намеснікам начальніка ўпраўлення па рэалізацыі тэхнікі на рынак Расійскай Федэрацыі маркетынгавага цэнтра ААТ «Мінскі трактарны завод» вось ужо 31 год. За гэты час работа стала для Таццяны Віктараўны неад'емнай часткай жыцця, а яе шматгадовыя напрацоўкі, адказнасць і прафесійнае майстэрства — выдатны прыклад для маладых пакаленняў спецыялістаў.

— Магу з упэўненасцю сказаць, што мае калегі сталі для мяне адной вялікай і дружнай сям'ёй, — дзеліцца яна. — Мне пашчасціла працаваць у калектыве аднадумцаў, людзей, якія робяць усё дзеля стабільнай дзейнасці і росквіту прадпрыемства.

На некаторы момант у думках Таццяна Віктараўна вяртаецца ў мінулае і ўспамінае, як рабіла першыя крокі ў прафесіі. Сваю работу на заводзе жанчына пачала аператарам электронна-вылічальных машын канструктарскага бюро механазборачнага прадпрыемства. З першых дзён работы дзяўчына праявіла сябе адказным спецыялістам, які аператыўна і якасна выконвае даручаныя абавязкі. Невыпадкова праз кароткі час малады спецыяліст стала інжынерам-канструктарам, а ў 2010 годзе была прызначана начальнікам бюро маркетынгавага цэнтра завода. З 2016 года Таццяна Віктараўна працуе на пасадзе намесніка начальніка ўпраўлення па рэалізацыі тэхнікі на рынак Расійскай Федэрацыі маркетынгавага цэнтра. Працуючы на заводзе, яна завочна скончыла Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт...

— Я таксама адсочваю ўзровень рэалізацыі прадукцыі, даведваюся, колькі тэхнікі яшчэ не прададзена, якая прадукцыя выраблена і г. д., — працягвае Таццяна Шурдзякова. — Затым звязваюся з генеральнымі дырэктарамі гандлёвых дамоў Расійскай Федэрацыі, даведваюся пра сітуацыю: як вядуцца продажы, якія адбыліся змяненні. На працягу дня вырашаю і шэраг бягучых пытанняў. Цесна супрацоўнічаем з Міністэрствам прамысловасці Рэспублікі Беларусь, а таксама з многімі міністэрствамі Расійскай Федэрацыі. Сітуацыя на рынку пастаянна мяняецца — і мы распрацоўваем адпаведныя мерапрыемствы для таго, каб прадукцыя завода заўсёды была канкурэнтаздольнай і запатрабаванай на расійскім рынку...

У 2019 годзе жанчыне было прысвоена званне «Ветэран працы», а сёлета партрэт адной з лепшых работніц прадпрыемства занесены на «Алею гонару» ААТ «Мінскі трактарны завод».

Работа на Мінскім трактарным заводзе з'яўляецца любімай справай і для сястры Таццяны — **Алесі Сяўкоўскай**, якая працуе на прадпрыемстве з 2005 года. Спачатку была эканамістам ва ўпраўленні канструктарскіх і эксперыментальных работ № 1. Як і сястра, Алеся Віктараўна завочна набыла вышэйшую адукацыю: скончыла Інстытут сучасных ведаў імя А. М. Шырокава. У 2018 годзе Алесі Віктараўне прапанавалі працаваць вядучым эканамістам у Цэнтры выпрабаванняў трактарнай тэхнікі холдынгу «МТЗ-холдынг». На гэтай пасадзе жанчына працуе і ў цяперашні час.

— Маім абавязкам з'яўляецца заключэнне дагавораў на правядзенні выпрабаванняў з арганізацыямі, якія ўваходзяць у холдынг, і з іншымі. Менавіта пасля атрымання пратакола нашых выпрабаванняў арганізацыі маюць права прадаваць сваю тэхніку, — расказвае Алеся Сяўкоўская.

### ЛЮБОЎ ДА ПРАФЕСІІ ПЕРАДАЛІ ДЗЕЦЯМ І ЎНУКАМ

— А пачынальнікам дынастыі быў наш дзядуля, **Іван Дзмітрыевіч Шурдзякоў**. Працаваць на завод ён прыйшоў у 1954 годзе намеснікам начальніка планава-дыспетчарскага бюро і застаўся верным сваёй справе на працягу ўсяго жыцця. У 1959 годзе Івану Дзмітрыевічу была аб'яўлена падзяка «За выпуск 100-тысячнага трактара «BELARUS». Тут жа, на заводзе, працавала і наша бабуля, **Клаўдзія Васільеўна**. З 1973 года і да выхаду на заслужаны адпачынак яна была поварам на камбінаце грамадскага харчавання Мінскага трактарнага завода, — расказваюць сёстры. — Дарэчы, сваё жыццё з прадпрыемствам звязаў і наш другі дзядуля — **Генадзь Васільевіч Дзітчанка**. Ён працаваў на прадпрыемстве з 1954 года, быў інжынерам аддзела тэхнічнага кантролю, а яго жонка, **Зінаіда Фёдараўна**, у 1970 годзе прыйшла працаваць на завод кантралёрам механазборачнага прадпрыемства.

У аддзеле знешняй каапераўцыі ў 1978 годзе пачала свой працоўны шлях і маці Таццяны і Алесі — **Тамара Іванаўна Шурдзякова**, якая была інспектарам па справаводстве. Яе агульны працоўны стаж склаў 42 гады. Бацька жанчын, **Віктар Генадзьевіч Дзітчанка**, працаваў на заводзе з 1972 года сталяром-цесляром у цэху выпрабаванняў. Гэтай жа справай займаўся і яго брат, **Аляксандр Генадзьевіч**, які з 1975 года працаваў у цэху доследнай вытворчасці.

З асаблівай цеплынёй Таццяна і Алеся ўспамінаюць, як у 2022 годзе яны разам са сваімі роднымі ў ліку іншых 60 сем'яў былі запрошаны на пасадку Алеі дынастый. Работнікі павінны былі пасадзіць маладое дрэўца дуба. У той час кожны адчуў вялікі гонар за сваю сям'ю і разам з гэтым — за ўсё прадпрыемства.

**Святлана СІЛЬВАНОВІЧ.**



Аляксандр Генадзьевіч Дзітчанка.

Зінаіда Фёдараўна Дзітчанка.

Генадзь Васільевіч Дзітчанка.

Тамара Іванаўна ШУРДЗЯКОВА.

Клаўдзія Васільеўна Шурдзякова.

Віктар Генадзьевіч Дзітчанка.

Іван Дзмітрыевіч Шурдзякоў.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ (ПОВТОРНЫХ) ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

**Собственник имущества (Продавец):**

**ОАО Станкозавод «Красный борец»**

извещает о проведении электронных торгов **(лот № 7231)** по продаже недвижимого имущества, принадлежащего обществу на праве собственности:

КОМПЛЕКС ЗДАНИЙ, с неотъемлемыми составными частями и принадлежностями,

расположенный по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Фридриха Энгельса, 19 и 19/1:

**здание кафе «Берёзка»**
рег. № 240/С-19011, общ. пл. 768,7 м²;
**здание магазина «Сигма»**
рег. № 240/С-19012, общ. пл. 251,3 м².

**Организатор торгов:** ООО «Госторги», адрес: 210027, г. Витебск, пр-т Строителей, 6, а/я 77; тел.: +375 (33) 3-155-185, +375 (29) 8-185-185, e-mail: info@auction24.by

Имеющиеся обременения в отношении имущества: обременения отсутствуют. Имущество расположено на земельном участке с кадастровым № 242400000001001292, за Продавцом зарегистрировано право постоянного пользования.

Электронные торги проводятся на электронной торговой площадке (ЭТП) «Аукцион 24», по электронному адресу https://auction24.by. Номер лота, вид выставляемого на торги имущества: **№ 7231**, Недвижимость.

Начальная цена – 388 437,97 бел. руб., в том числе НДС 20 % – 64 739,66 бел. руб.

Размер шага составляет 19 421,90 бел. руб., 5 % от начальной цены лота с округлением в большую сторону до целого числа и не изменяется в течение всего аукциона.

**Сроки и место приема заявлений для участия в торгах:** заявления на участие в торгах, платежный документ о перечислении задатка с отметкой банка, копии свидетельства о государственной регистрации, учредительных документов, документов, подтверждающих полномочия участника торгов (доверенности), направляются по эл. почте: **info@auction24.by,** начиная **с 08.00 12.12.2025 и заканчивая в срок не позднее 23.12.2025 до 17.00.**

**Дополнительно для участия в электронных торгах на ЭТП «Аукцион 24» необходимо пройти регистрацию в качестве участника торгов и подать заявку в электронном виде.**

**Дата и время начала и завершения торгов: 24.12.2025 с 11.00 до 16.00.**

**Размер задатка для участия в торгах:** 10 % от начальной цены (стоимости) предмета торгов перечисляется до подачи заявления на расчетный счет организатора торгов (оператора ЭТП) **BY38 PJCB 3012 2044 9910 0000 0933 в ОАО «Приорбанк» г. Минск, БИК PJCBBY2X, УНП 391861948.**

Повторные торги проводятся с повышением начальной цены. Считаются состоявшимися при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.

Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее **30 (тридцати)** календарных дней со дня завершения электронных торгов. Победитель торгов (претендент на покупку) в течение **30 (тридцати)** календарных дней с даты проведения электронных торгов оплачивает цену предмета торгов. Изменение данных сроков возможно по письменному согласованию с собственником предмета торгов.

**Справочная информация:** осмотреть имущество, расположенное по адресу: г. Орша, ул. Фридриха Энгельса, 19 и 19/1, можно в любое время по предварительной договоренности с организатором торгов.

Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов осуществляется в соответствии с законодательством.

Победитель или единственный участник (претендент на покупку) возмещает: расходы по оплате вознаграждения (аукционного сбора) согласно прейскуранту, размещенному на сайте оператора ЭТП (https://auction24.by) – Организатору, фактические затраты за публикацию объявлений о проведении торгов, а также расходы по независимой оценке предмета торгов – Продавцу. Возмещение затрат по организации и проведению аукциона победитель осуществляет не позднее 5 (пяти) календарных дней с момента завершения торгов.

**Подробная информация размещена на сайте:**
**https://auction24.by.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

**Организатор: Государственное предприятие «Жилищное коммунальное хозяйство № 2 Фрунзенского района г. Минска»,**
*220104, г. Минск, ул. Матусевича, 42, тел. +375173600685.*

Торги проводятся **12.01.2026 г.**
ЭТП «БУТБ-Имущество», **www.et.butb.by.**

ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НА ЧАСТЬ ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ,

**расположенное по адресу: г. Минск ул. Неманская, 48, пом. 72**

Окончание приема заявлений – **06.01.2026, до 15.00.**
Подробная информация на сайте **www.et.butb.by.**

УНП 192605364

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

**Организатор: Государственное предприятие «Жилищное коммунальное хозяйство № 2 Фрунзенского района г. Минска»,**
*220104, г. Минск, ул. Матусевича, 42, тел. +375173600685.*

Торги проводятся **09.01.2026 г.**
ЭТП «БУТБ-Имущество», **www.et.butb.by.**

ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НА ИЗОЛИРОВАННОЕ ПОМЕЩЕНИЕ,

**расположенное по адресу: г. Минск, ул. Налибокская, 4, пом. 138.**

Окончание приема заявлений – **05.01.2026, до 15.00.**
Подробная информация на сайте **www.et.butb.by.**

УНП 192605364

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ

Организатор торгов: **ООО «ТрастАудитКонсалт»**
(УНП 692017051), 222304, Минская обл., г. Молодечно,
ул. Металлистов, д. 2В, пом. 14, тел. (8029) 777-91-61;
Публичные торги в форме аукциона в процедуре ликвидации
будут проведены **22.01.2026 г. в 16.00**
по адресу: г. Минск, ул. Максима Богдановича, д. 70, пом. 1Н

**Продавец: ООО «Эрбен груп» (УНП 491082052)**
**(Продавец является плательщиком НДС)**

| № лота | Наименование предмета торгов | Начальная цена с НДС, BYN |
|---|---|---|
| 1 | Ванна закалочная | 5000,00 |
| 2 | Биениемер ПБ-500 (Г-28) | 1900,00 |
| 3 | Инвертор сварочный ZX7-200 | 200,00 |
| 4 | Машина деревообрабатывающая | 700,00 |
| 5 | Ножницы гильотинные | 5000,00 |
| 6 | Прибор для измерения твердости | 600,00 |
| 7 | Сварочный аппаратLincoln Powertec 425S | 5200,00 |
| 8 | Абразивоструйная камера | 3800,00 |
| 9 | Заточной станок 3Д642 | 3000,00 |
| 10 | Зубофрезерный станок 5К310 | 15000,00 |
| 11 | Координатно-расточрой станок 2431 | 9900,00 |
| 12 | Круглошлифовальный станок, 3М151В | 22000,00 |
| 13 | Обрабатывающий центр с ЧПУ DT600 | 126000,00 |
| 14 | Плоскошлифовальный станок, 3Д711ВФ11 | 20000,00 |
| 15 | Пресс кривошипный, инв. № 01049012 | 15000,00 |
| 16 | Радиально-сверильный станок, 2К52 | 5000,00 |
| 17 | Резьбонакатный станок UPW 12,5*70 | 20000,00 |
| 18 | Рольганг | 1800,00 |
| 19 | Станок внутришлифовальный 3К227В | 12000,00 |
| 20 | Станок для обвязки Strapex CH 5610 | 4900,00 |
| 21 | Станок заточной 3Б634 | 900,00 |
| 22 | Станок заточной настольный | 900,00 |
| 23 | Станок заточной станок 3Б634 | 900,00 |
| 24 | Станок зубофрезерный 5К310 | 15000,00 |
| 25 | Станок полуавтомат круглошлифовальный 3М151 | 25000,00 |
| 26 | Строгальный станок 7Б135 | 5000,00 |
| 27 | Токарно-винторезный станок модели 163 | 3500,00 |
| 28 | Токарно-винторезный станок, 16Д25 | 8000,00 |
| 29 | Токарно-винторезный станок, 1М63МФ101 | 10000,00 |
| 30 | Токарно-винторезный станок, ВСТ 625 -21CNC | 40000,00 |
| 31 | Токарно-винторезный станок, ГС 526УЦ | 20000,00 |
| 32 | Токарно-винторезный станок,ГС526УМ | 20000,00 |
| 33 | Токарный станок Schaublin 102N 80 | 5000,00 |
| 34 | Токарный станок с ЧПУ PINACHO MUSTANG 225 | 57000,00 |
| 35 | Токарный станок с ЧПУ; модель LT210M | 142000,00 |
| 36 | Установка для мойки деталей VFG L800 FP | 4000,00 |
| 37 | Установка коспрессорная ВК20-8 | 12500,00 |
| 38 | Фрезерный станок, F400 | 15000,00 |
| 39 | Фрезерный станок, FNK25 | 14000,00 |
| 40 | Фрезерный станок, VF-24 | 13000,00 |
| 41 | Электропечь | 8000,00 |
| **Местонахождение имущества: г. Житковичи, ул. Фрунзе, 67Г** | | |

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 7779161.

Дополнительные сведения об имуществе, спецификациях и порядке проведения аукциона опубликованы: https://cloud.mail.ru/public/9NPK/GubVW1dmk.

**Для участия в торгах необходимо в срок до 17.00 20.01.2026:**

1) зарегистрироваться и подать заявление на участие в публичных торгах по выбранному лоту и соглашение о задатке по электронной почте info@truster.by либо по адресу: 222304, г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 2В, пом. 14;

2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY88 UNBS 3012 2173 7000 0000 0933 в ЗАО «БСБ Банк», BIC: UNBSBY2X, получатель – ООО «ТрастАудитКонсалт», УНП 692017051.

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов.

Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 %. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в размере 5 % от цены продажи лота в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 календарных дней со дня проведения торгов, но не ранее возмещения затрат, связанных с организацией и проведением торгов. Срок оплаты предмета торгов: не позднее 15 рабочих дней со дня проведения торгов.



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ
ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие**
**«Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321)
по поручению **открытого акционерного общества «Борисовский шпалопропиточный завод»**
(продавец, контактный телефон: 8 (0177) 90 01 29)
проводит **электронный** открытый аукцион

по продаже **маятникового торцовочного станка-450, 2021 г. в.,**

**физический износ – 10 %, размеры обрабатываемого материала: толщина – до 160 мм, ширина – до 380 мм, длина – не ограничена, диаметр дисковой полы – 450х50 мм, установочная мощность – 3кВт, скорость резанья – 60 м/с, частота вращения пильного диска – 3000 об/мин, габариты станка – 640х1100х1550 мм, вес станка – 110 кг, производитель – ООО «Техностанкострой» (Республика Беларусь), расположенного по адресу:**
**Минская область, г. Борисов, ул. Сенная, 5.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 3 046,64** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 304,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 37 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

**Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.**

**Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: torgi.rlt.by, minsk-region.gov.by.** Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 27.03.2025, 16.10.2025.

Электронные торги состоятся **29.12.2025** в **10.00**. Заявления с прилагаемыми к ним документами на участие в электронных торгах принимаются не позднее **23.12.2025** до **17.00**.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: (8044) 549-44 -14.**

УНП 600012389




НА СВАІМ МЕСЦЫ

# СУЦІШЫЦЬ ЧУЖЫ БОЛЬ

## Як стрымаць эмоцыі і працаваць у напружаным рэжыме, расказвае жанчына-хірург



Прафесія хірурга з'яўляецца адной з асноўных у сістэме аховы здароўя, займаючы другое месца пасля тэрапеўтаў. Аднак, нягледзячы на высокую колькасць жанчын сярод урачоў, мужчын-хірургаў усё ж больш, чым жанчын. І гэта зразумела. Прафесія хірурга патрабуе фізічнай загартоўкі, вытрымкі і самавалодання. Нярэдка прыходзіцца працаваць у экстрэмальных сітуацыях, калі лік ідзе на секунды. Тут вельмі важна пакінуць убаку свае эмоцыі, засяродзіць увагу на галоўным і аператыўна прыняць правільнае рашэнне. Калі ж хтосьці лічыць, што жанчыне такія якасці не ўласцівыя, той глыбока памыляецца. Пацвярджэнне таму — напрацоўкі Анастасіі САНКОВІЧ, хірурга Рэспубліканскага цэнтра камбустыялогіі пры Мінскай гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі.

Прызнацца шчыра, калі я сустрэлася з Анастасіяй Андрэеўнай, цяжка было паверыць, што перада мной — хірург. Я не магла зразумець, як гэта мілая ўсмешлівая жанчына выбрала такую няпростую прафесію і як ёй удаецца выконваць вялікі аб'ём работы ў напружаным рэжыме.

**— Як правіла, у нашу ўстанову паступаюць людзі, што пацярпелі ад пажараў. Многія з іх знаходзяцца ў цяжкім стане. Працуючы «на адрэналіне», хірург клапоціцца аб адным — выратаваць жыццё чалавека. Тут не месца залішнім эмоцыям, сваю работу трэба зрабіць на самым высокім узроўні. У большасці выпадкаў для таго каб чалавеку аднавіць сваю нармальную жыццядзейнасць, патрэбны не адзін месяц, — расказвае Анастасія Андрэеўна.**

— Быць урачом, выратоўваць жыцці людзей — аб гэтым я марыла з дзяцінства,— шчыра прызнаецца суразмоўца. — Мне было заўсёды цікава, як працуе арганізм чалавека. Памятаю, як разам са сваімі сяброўкамі часта гуляла «ў доктара». Я заўсёды захаплялася прафесіяй урача, мне таксама вельмі хацелася дапамагаць людзям. Добра вучылася ў школе, паглыблена вывучала біялогію, хімію, і ўжо ў старэйшых класах свой выбар зрабіла цвёрда — Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт.

У студэнцкія гады Анастасія зразумела, як шмат значыць для яе будучая прафесія. Яна ўваходзіла ў лік лепшых студэнтаў установы, і калі на шостым курсе надышоў час праходзіць субардынатуру па прафесіі, без ваганняў выбрала хірургічны профіль.

Урачэбную практыку ў хірургічным аддзяленні Гомельскай гарадской клінічнай бальніцы № 2 суразмоўца ўспамінае і сёння.

— Памятаю, з якой цікавасцю я назірала за работай вопытных хірургаў. Мяне ўразілі іх прафесійнае майстэрства, унутраны спакой і асаблівая дакладнасць, уменне засяродзіць увагу на дэталях, — расказвае спецыяліст. — Памятаю і свой першы ўдзел у аперацыі па выдаленні грыжы. Я была асістэнтам хірурга, хвалявалася вельмі. Паступова да мяне прыйшла большая ўпэўненасць, я стала часцей удзельнічаць у складаных аперацыях з вопытнымі хірургамі. Не менш важна і тое, што на працягу ўсяго перыяду навучання мы з аднакурснікамі падтрымлівалі адзін аднаго, разам радаваліся сваім поспехам.

Пасля вучобы Анастасія атрымала размеркаванне на работу ў Лепельскую цэнтральную раённую бальніцу. Менавіта тут у маладога хірурга з'явілася магчымасць праявіць свае атрыманыя навыкі. Дарэчы, яна стала першай жанчынай-хірургам у Лепельскім раёне.

Праз чатыры гады, ужо маючы адпаведны працоўны вопыт, Анастасія Санковіч вырашыла паглыбіць сваю прафесійную кваліфікацыю. Для гэтага яна пераехала ў сталіцу і паступіла ў клінічную ардынатуру. Вучобу на працягу двух гадоў хірург сумяшчала з работай у гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі.

— Такім чынам у мяне з'явілася больш магчымасцяў для прафесійнага развіцця. Я брала ўдзел у шматлікіх складаных аперацыях, пазнаёмілася з многімі высокакваліфікаванымі спецыялістамі і пераканалася ў тым, што гэта вельмі важны этап у маім прафесійным станаўленні.

Працуючы ў цэнтры камбустыялогіі, яна практычна кожны дзень сутыкаецца са складанымі траўмамі. Але жаданне хутчэй дапамагчы чалавеку, суцішыць яго боль, пераважвае ўсе эмацыянальныя моманты. Яна на сваім месцы — вельмі важнае для ўрача адчуванне.

— Сярод моладзі нярэдка даводзіцца чуць разважанні наконт таго, што для атрымання дастойнай зарплаты і павышэння прафесійнага ўзроўню трэба працаваць за мяжой. Абсалютна не згодна з гэтым, — кажа вопытны хірург. — Магу з упэўненасцю сказаць, што наша медыцына дасягнула высокага ўзроўню. Мы можам рабіць складаныя віды аперацый, хутка аказваць дапамогу ў надзвычайных выпадках. Для гэтага ў нас ёсць і сучаснае высокатэхналагічнае абсталяванне, і добра падрыхтаваныя спецыялісты. Беларускія ўрачы маюць шэраг карысных напрацовак, якімі дзеляцца з калегамі з-за мяжы. Нам ёсць кім і чым ганарыцца. Моладзі, якая робіць першыя крокі ў прафесіі, я шчыра жадаю цвёрда ісці да пастаўленай мэты, не звяртаючы ўвагу на цяжкасці. Сваю справу трэба любіць усім сэрцам, укладваць у яе душу, і яна абавязкова прынясе поспех!

**Святлана СІЛЬВАНОВІЧ.**
**Фота з асабістага архіва гераіні.**



ДЗЕЙНЫЯ АСОБЫ

# ПАЧЫНАЛАСЯ ЎСЁ З ЗАХАПЛЕННЯ...

Першыя дні сёлетняга снежня Яўгену Осіпаву запомняцца паездкай у Маскву, у Галерэю мастацтваў Зураба Цэрэтэлі, на 13-ю цырымонію ўручэння Міжнароднай прэміі «Філантроп». Званне лаўрэата народнаму майстру Рэспублікі Беларусь прысуджана сумесным рашэннем савета папячыцеляў, журы і аргкамітэта, што пацвярджае прызнанне дасягненняў бярэзінскага разьбяра не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі.



...Колькі глядзіш на вырабы гэтага майстра — столькі здзіўляешся ды захапляешся. Гэта ж колькі цярпення трэба ўкласці ў ланцужок з дрэва ці раўнюткі шарык, колькі душы ў скульптуру жанчыны-музы? Колькі фантазіі — у казачныя сюжэты на драўляных лыжках, каб ніводны з іх не паўтарыўся?

Для Яўгена Паўлавіча Осіпава нічога незвычайнага ў гэтым няма: спрытнасць рук, маўляў, і ніякага махлярства...

— З дрэва я пачаў выразаць у сталым узросце, гадоў у 45, — прызнаецца майстар. — Да ўсяго даходзіў сваім розумам, сваім жа мазалём, а часта яшчэ і параненымі рукамі. Першымі творамі сталі крэслы, якія ў якасці падарунка адправіў у Маскву. Пасля пачаў выразаць нешта драбнейшае, сувенірнае.

У асартыменце Яўгена Паўлавіча — і драўляныя лыжкі, на кожнай з якіх сур'ёзны ці гумарыстычны сюжэт, кампазіцыя, карціна, бо проста ўзяць ды выразаць лыжку — гэта, на думку майстра, зусім нецікава і нават сумна. А так — захапляльны творчы працэс: выраб спачатку «малюецца» ў галаве, прадумваюцца ўсе дэталі... Аднойчы, напрыклад, узнікла ідэя зрабіць не проста самую вялізную, але і самую незвычайную лыжку — з дуба з нашым міфічным цмокам даўжынёй больш за 20 метраў.

— Лёгкіх шляхоў мы і раней не шукалі, — прызнаецца майстар, але вось гэты быў дужа складаным. Працавалі разам з памочнікамі з восені да вясны, бо драўніна ў дуба вельмі цвёрдая, шчыльная...

У пакоі-музеі драўлянай лыжкі (адзіным, дарэчы, у нашай краіне) шмат вырабаў Яўгена Паўлавіча, прычым з самых розных дрэў. Самае падатлівае з іх — ліпа, з якой найчасцей і праце майстар. Яго калекцыя лыжак пабывала ў Кітаі, куды Осіпаў трапіў разам з дэлегацыяй Мінскай вобласці, сам ён браў удзел у двух фестывалях у Турцыі, даваў майстар-клас разьбы ў беларускім пасольстве ў Маскве... Што ўжо казаць пра тутэйшыя, раённыя ды рэспубліканскія конкурсы, святы, фестывалі.

— Дыпломаў, грамат, падзяк — поўная тумбачка, — гаварыцца Яўген Паўлавіч. — Дзякуючы захапленню разьбой я змог і свет паглядзець, і з вядомымі людзьмі пазнаёміцца. Маю званне народнага майстра Беларусі.

Іншымі словамі, разьба па дрэве з хобі, якое было спачатку, ператварылася ў справу жыцця. А, між тым, за плячыма ў майстра амаль 40 гадоў педагагічнага стажу.

Настаўнічаць у Бярэзінскі раён Яўген Паўлавіч прыехаў па размеркаванні з Віцебшчыны. Выкладаў фізіку, матэматыку, інфарматыку, вёў заняткі ў фотагуртку. Разам з вучнямі, успомніўшы сваё школьнае захапленне мадэляваннем, майстравалі самалёт, які нават уздымаўся ў неба... Адным словам, творчасці ў жыцці яго быццам хапала. «Драмала» да пары хіба разьба па дрэве.

Трэба сказаць, што справа гэта не з лёгкіх, не для дзявочых, не для жаночых рук. Між тым дзяўчынкі — нават цэлая сям'я разам з мамай — сярод яго вучняў былі.

— Магчыма, далёка не ўсе дзеці, якія наведвалі школу лыжкарскага майстэрства ў нашым цэнтры рамёстваў, будуць займацца разьбой па дрэве, але асобныя — раней ці пазней абавязкова, — упэўнены Яўген Паўлавіч.

Гэта вера ў майстра — з уласнага жыцця, дзе былі і цёмныя палосы (перыяды адчаю), і светлыя, калі з шасці гадзін раніцы і да глыбокай ночы можна было пракарпець над дрэвам, каб ажывіць яго, стварыць вобраз, для чаго патрэбны не толькі тэхнічныя навыкі, але і рэдкі мастацкі густ, дакладнасць, уменне ствараць прыгажосць.

Усё гэта пераняў ад бацькі і сын суразмоўцы: жывучы і працуючы ў Мінску, Павел знаходзіць час, каб адвесці душу — папрацаваць з дрэвам.

У самога ж Яўгена Паўлавіча разам з найбліжэйшымі планамі ёсць перспектыўныя. Адна з яго задум — дапоўніць кампазіцыю «На Купалле», дзе будуць і папараць-кветка, і касцёр, і гарманіст. Усё — як было. І, напэўна ж, будзе?

**Ала Альфер,** *г. Беразіно.*

ПОГЛЯД

# МЫ — КАВАЛІ... І ШЧАСЦЯ СВАЙГО, І НЯШЧАСЦЯ

**Як, дзе знайсці сваю другую палавінку і не памыліцца ў выбары, які чынам зразумець, што гэта менавіта твой чалавек, з якім хацелася б крочыць па жыцці?**

Такія пытанні, уступаючы ў самастойнае жыццё, задае сабе, мабыць, кожная дзяўчына і кожны хлопец, бо прырода бярэ сваё: хочацца кахаць і быць каханым (каханай), для кагосьці прыбірацца, бегаць на спатканні, хадзіць зусім няважна куды, галоўнае — каб заўсёды разам.

А як жа добра тады сядзець поруч, прытуліўшыся адзін да аднаго, любавацца зорным небам і радавацца таму, што ты нарадзіўся, што жывеш на свеце! Вось так бы, здаецца, сядзеў і сядзеў, хоць да самай раніцы!..

Але ж і потым, калі развіднее, так цяжка расстацца, разысціся ў розныя бакі...

Вось гэта, апошняе, можа азначаць, што сусед (суседка) па лавачцы і ёсць той самы твой чалавек, з якім можна стварацца сям'ю.

Заканамернае пытанне: чаму ж тады, стварыўшы, многія пачынаюць сварыцца, біць посуд, раўнаваць, папракаць, нават ненавідзець?

На маю думку, нічога нечаканага і дзіўнага ў тым няма. Проста ўсім закаханым уласціва насіць ружовыя акуляры. А потым, па вяселлі, іх здымаць і бачыць, што абранік часам зусім не тое кажа, не так разумее, не хоча дапамагаць...

Пры сапраўдных пачуццях, як бы ні было цяжка, ты не кінеш яго (яе): набярэшся цярпення, падкажаш, дапаможаш, далікатна павучыш і ўрэшце будзеш разам у горы і радасці, у хваробе і здароўі, бо няма людзей ідэальных.

Раней як было? Мы заканчвалі школу і цудоўна разумелі, што трэба некуды паступаць, вучыцца, працаваць, набываць прафесію і паралельна шукаць сваю палавінку, ствараць сям'ю, абавязкова нараджаць і гадаваць дзяцей, як бы ні было цяжка ў матэрыяльным плане.

Зразумела, што і тады ў многіх сем'ях здараліся непаразуменні, узнікалі спрэчкі, аднак сужэнцы не спяшаліся разбураць сям'ю, распачынаць нейкія новыя адносіны, бо верылі, што з цягам часу ўсё яшчэ можа наладзіцца.

Час і сапраўды найлепшы суддзя: мы пакрысе абжываліся (ну не ўсё ж адразу!), атрымлівалі свае жыллё, дзеці падрасталі...

З аднаго боку, гэта, можа, і правільна, што цяпер яны імкнуцца зрабіць кар'еру, і толькі потым, моцна стаўшы на ногі, стварыць сям'ю. А з іншага боку, можна ўпусціць найкаштоўнейшы час і застацца ні з чым...

На маю думку, можна (і трэба!) не баяцца цяжкасцяў — сумяшчаць вучобу, працу, кар'еру з будаўніцтвам сям'і, выхаваннем дзяцей.

Шчаслівыя жонкі за добрымі мужамі, якія і ў маральным, і ў матэрыяльным плане ўсё робяць для сваёй сям'і, для дзяцей. Няшчасныя тыя, дзе гаспадар жыве як бы сам па сабе. А калі яшчэ і не працуе, калі цягнецца да чаркі ды пачынае ў гэтую багну цягнуць сям'ю...

Не асуджаю: калі захоўваць шлюб не выпадае, то лепш сапраўды расстацца. Аднак я за тое, каб маладым і сталым сужэнцам было «горка» толькі падчас вяселля, каб дзеці раслі пры маме і тату, у поўных сем'ях. Але ж для гэтага трэба прыкласці шмат намаганняў і цярпення — абодвум бацькам, бо менавіта яны кавалі і шчасця, і няшчасця — свайго і сваіх дзяцей.

**Таццяна Чэкед,** *г. Гомель.*


**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
информирует о проведении повторных
электронных торгов по продаже имущества,
принадлежащего
**РУП «Белоруснефть-Минскоблнефтепродукт»**
(Продавец).

**Электронные торги состоятся 24.12.2025.**

**Лот № 1.** Трактор (кат. В), модель «Беларус – 3022ДЦ», идентификационный № 30200745.
Начальная цена без НДС – 16 140,00 руб.

**Лот № 2.** Трактор (кат. В), модель «Беларус – 3022», идентификационный № 30201833.
Начальная цена без НДС – 16 140,00 руб.

**Лот № 3.** Зерноуборочный комбайн (кат. D), КЗС-1218-10, идентификационный № 03323.
Начальная цена без НДС – 8 460,00 руб.

**Лот № 4.** Жатка для грубостебельных культур ЖГР - 4,5, заводской № 507.
Начальная цена без НДС – 2 980,00 руб.

**Лот № 5.** Комплекс кормоуборочный КВК-800-36, заводской № 596.
Начальная цена без НДС – 7 240,00 руб.

**Лот № 6.** Подборщик КВС-4-3900000, заводской № 0489.
Начальная цена без НДС – 1 520,00 руб.

**Местонахождение**
Лотов №№ 1-3: Минский обл., Логойский р-н, аг. Гостиловичи;
Лотов №№ 4-6: Минская область, Логойский район, аг. Гостиловичи, ул. Трудовая, 4.

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by, Едином реестре au.nca.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**
УНП 190055182



**Брестский филиал
РУП «Институт недвижимости и оценки»
извещает о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества, принадлежащего
РУП «Брестское отделение Бел. ж. д.»**

| Наименование и местоположение объекта | Начальная цена продажи, руб. | Срок договора аренда |
|---|---|---|
| **ЛОТ № 1:** право заключения договора аренды недвижимого имущества: гаражи с инв. № ЕГРНИ 100/С-33426, площадью 1113,4 кв. м, по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Красногвардейская, 140А/3 | 2 089,85 | 3 года |

**Организатор аукциона:**
Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», 224005 г. Брест, ул. Наганова, 10-329, 80162 40 87 01, 40 87 41

**Аукцион состоится 29 декабря 2025 г. в 12.00
по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-41, 40-87-01**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь, а также на сайте организатора аукциона ocenkabrest.by



**Брестский филиал
РУП «Институт недвижимости и оценки»
ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**Лот №1: Трактор «Беларус-1221», год выпуска 2005 г., регистрационный знак АК-1 8520**

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 19 800,00 | Размер задатка, руб. | 1 980,00 |
|---|---|---|---|

**Местонахождение объекта**: 224025, г. Брест, ул. Катин Бор, 99Б. **Продавец:** ОАО «Брестский райагросервис» 224025, г. Брест, ул. Катин Бор, д. 99Б, тел. 80162298747. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 13 января 2026 г. в 11.00
по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-41**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 12 января 2026 г. до 17.00**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие**
**«Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
*(организатор торгов*
*и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by,*
*местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321)*
по поручению **ОАО «Миноблавтотранс» филиал**
**«Автомобильный парк № 20»**
*(Продавец, местонахождение:*
*Минская обл., г. Червень, ул. Н. Зеневича, 53)*
проводит открытый аукцион

по продаже **автомобиля грузового самосвала MAZ-5516A5-371,**

**2011 г. в., регистрационный знак АК 4026-5,**
**рама № Y3M5516A5B0004496, цвет белый (аварийный).**

Транспортное средство расположено по адресу:
Минская область, г. Червень, ул. Н. Зеневича, 40.

Начальная цена с НДС (20 %) – **19 920,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **1 992,00** бел. руб.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, OTHR.

Условия аукциона:

- имущество приобретается на условиях 100 % предоплаты и оплаты Покупателем (единственным участником) аукциона комиссионного вознаграждения банку за проведения данного платежа;
- Покупатель обязан за свой счет принять приобретаемое имущество, в том числе осуществление вывоза, хранения, погрузочно-разгрузочных работ;
- на Покупателя возлагается обязанность по переоформлению (в ГАИ, военкомате), снятию и постановке на учёт приобретаемого имущества за свой счет.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) рабочих дней с даты проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения: в любое время, но не позднее, чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течении 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение в размере: 10 (десяти) процентов от цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию извещения о проведении торгов.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.

Электронные торги состоятся **09.01.2026 в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **06.01.2026** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 102-21-17, 516-80-64.**
**Тел. для осмотра: 8-01714-28-601.**

УНП 601070397



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка». 220004, г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191224638. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Витязь». 210605, г. Витебск, ул. Петруся Бровки, д. 13а. УНП 300031652 |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **Гараж на 50 автомашин** (Здание специализированное автомобильного транспорта), инв. № 200/С-73561, общ. пл. 2488,6 кв. м, сост. части и прин-ти: очистные сооружения, эстакада для ремонта машин, наружное освещение, кабельные линии от энергоблока до гаража, канализация хозфекальная от гаража, канализация ливневая от гаража, наружная теплотрасса в здание гаража, водопровод хозпитьевой, 4 ограждения, ограждение металлическое очистных сооружений, покрытие, площадка. ***Адрес: Витебская обл., г. Витебск, ул. Петруся Бровки, 34.*** ***Обременение:*** договоры аренды | |
| ***Сведения о земельном участке:*** общ. пл. 11,6686 га (доля продавца: 8665/10000) предоставлен продавцу на праве аренды по 10.08.2056 для строительства и обслуживания административно-производственных зданий | |
| В состав лота входит иное имущество, его состав размещен на ЭТП «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by) | |
| **Начальная цена лота, с НДС 20 % – 2 496 058,94 бел. рублей** | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB301 20048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638 | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 20 (двадцати) календарных дней** со дня завершения электронных торгов | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов:** если между продавцом и покупателем (победитель либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты продавцу за проведение независимой оценки, затраты организатору торгов на их проведение и оплатить вознаграждение **3 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 27.01.2026 г. с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **26.01.2026 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by | |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |



Свидетельство о государственной регистрации
ООО «ТББ щебень» № 191683570 от 28.07.2011 г.
в связи с утерей **считать недействительным.**


БЯСПЕКА

# ПРАЗ АГОНЬ, ВАДУ І ХІМІЧНЫЯ ЗАБРУДЖВАННІ

## Больш за 3 500 ратавальнікаў і 1 300 адзінак тэхнікі МНС Беларусі кожны дзень гатовы прыйсці на дапамогу людзям

Штогод па нумарах «101» і «112» паступае больш за 150 тысяч выклікаў. Каб дапамагчы грамадзянам у розных надзвычайных сітуацыях, у нашай краіне створана 12 спецыялізаваных службаў МНС. Сёння даведаемся пра тры з іх: вадалазна-ратавальную, газадымаахоўную і хімічнай і радыяцыйнай абароны.





### НА ГЛЫБІНІ І НА ПАВЕРХНІ

Сёння ў сістэме МНС функцыянуе 182 падраздзяленні вадалазна-ратавальнай службы: 8 штатных, якія базіруюцца ў абласных цэнтрах, і 174 падраздзяленні з групамі выратавання на водах. Яны займаюцца выключна дапамогай тым людзям, якія церпяць бедства на вадзе, то-бок без падводных работ. Цэнтр вадалазна-ратавальнай службы Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння «ЗУБР», па словах **начальніка цэнтра Алега СЦЯПУКА**, працуе не толькі ў сталіцы, але і па ўсёй краіне.

Работа, безумоўна, напружаная, не залежная ад сезонаў: няўдачлівыя рыбакі і бясстрашныя купальшчыкі знаходзяцца ў любую пару года. Таму апроч асноўнай сваёй дзейнасці вадалазы штодня адпрацоўваюць апусканні для падтрымання навыкаў, займаюцца фізічнай падрыхтоўкай, удзельнічаюць у спаборніцтвах. Усё для таго, каб у любы момант прыйсці на дапамогу, нават за межамі краіны. Напрыклад, у 2014 годзе



беларускія ратавальнікі дапамагалі калегам у Сербіі падчас разбуральнага затаплення — колькасць ападкаў была самай вялікай за апошнія 120 гадоў вымярэнняў на гэтай тэрыторыі. «Сёння наша служба абсталявана самымі сучаснымі тэхнічнымі сродкамі. Гэта і гідрацыклы, і судны на паветраных падушках, і аэралодкі «Піранння-4», — пералічвае Алег Сцяпук. — Апошнія — універсальная навінка, здольная перамяшчацца як па вадзе, лёдзе, так і па сушы».

Большасць вадаёмаў Беларусі — прэсныя азёры і хуткія рэкі з абмежаванай бачнасцю пад вадой. У залежнасці ад часу і месца апускання вадалазам часта даводзіцца працаваць практычна ўсляпую, арыентуючыся навобмацак. Таму перад кожным апусканнем каманда абавязана старанна распланаваць парадак дзеянняў, дакладна вызначыць задачы кожнага, у тым ліку на выпадак пазаштатных сітуацый. Такі падыход дапамагае трымаць сябе ў руках нават у самых складаных умовах.

### КАЛІ РАЗБІЎСЯ ГРАДУСНІК

Небяспека работы спецыялістаў службы хімічнай і радыяцыйнай абароны на першы погляд зусім незаўважная. **Аляксандр КЛЯУС, намеснік начальніка цэнтра хімічнай і радыяцыйнай абароны РАСП «ЗУБР» МНС**, тлумачыць, што асноўнай задачай іх службы з'яўляецца правядзенне спецыяльных работ на тэрыторыі хімічнага заражэння і радыеактыўнага забруджвання. Сюды ўваходзіць цэлы комплекс дзеянняў: ад разведкі і вымярэння ўзроўню небяспечных рэчываў або радыяцыі, лакалізацыі яе крыніц да дэзактывацыі тэхнікі і нават спецыяльнай санітарнай апрацоўкі насельніцтва.

Але больш за 90 % ад усіх выклікаў службы прыпадаюць на разбітыя градуснікі, зрэдку — на паломку прамысловага абсталявання. Напрыклад, нядаўна ў Салігорску на 4-м рудаўпраўленні прадпрыемства «Беларуськалій» адбылася ўцечка салянай кіслаты. Разведкай мясцовасці, ратаваннем пацярпелых і іншымі работамі займалася тады менавіта служба хімічнай і радыяцыйнай аховы.

На ўзбраенні ў яе супрацоўнікаў — далёка не самае простае абсталяванне. Для ліквідацыі надзвычайных сітуацый маюцца аўтамабілі хімічнай і радыяцыйнай абароны, спецыяльныя прыборы для ліквідацыі цечы і нават мабільная лабараторыя, з дапамогай якой прама на месцы можна правесці неабходныя даследаванні (дарэчы, у краіне яна адзіная). А газааналізатары на чатыры элементы (хлор, аміяк, аксід вугляроду і выбухованебяспечныя газы) дапамагаюць даведацца, чым дакладна забруджана тэрыторыя. І гэта яшчэ не ўсё — спектрометрамі ратавальнікі вызначаюць склад радыеактыўных рэчываў у прадуктах харчавання і будматэрыялах, спецыяльнымі прыборамі можна выявіць цяжкія металы ў глебе і вадзе.

### ДЛЯ МОЦНЫХ ЦЕЛАМ І ДУХАМ

Газадымаахоўная служба займаецца забеспячэннем і арганізацыяй работы ратавальнікаў у непрыдатным для дыхання асяроддзі. У Беларусі, дзе пажары застаюцца самай частай надзвычайнай сітуацыяй, яе супрацоўнікі, напэўна, самыя запатрабаваныя з усіх спецыялізаваных службаў. Прычым, як тлумачыць **Дзяніс ІГНАТОВІЧ, старшы памочнік начальніка штаба ліквідацыі надзвычайных сітуацый Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС**, небяспечны часам не столькі агонь, колькі дым ад яго. Больш за ўсё людзі гінуць менавіта з-за атручэння чадным газам. На тое, каб вывесці з месца задымлення пацярпелых і ліквідаваць узгаранне, у ратавальнікаў ёсць усяго каля 30 хвілін — на столькі хапае сціснутага паветра ў дыхальным апараце. Калі патрэбна больш часу — апарат мяняюць і зноў вяртаюцца ў небяспечнае асяроддзе.

Дарэчы, важыць такі апарат не менш за 30 кілаграмаў, а з дадатковымі інструментамі — усе 50. Таму прафесія, вядома, патрабуе фізічнай сілы і вынослівасці. Падтрымліваць форму дапамагаюць пастаянныя трэніроўкі. Заняткі для газадымаахоўнікаў праводзяцца не радзей за два разы на месяц, а раз у квартал іх чакае абавязковае выпрабаванне ў дымакамеры — спецыяльным трэніровачным комплексе, дзе штучна ствараецца абстаноўка, блізкая да рэальнага пажару. На вучэннях усё адпрацоўваецца да аўтаматызму: пракладка рукавоў да ўмоўнага месца ўзгарання, пошук і эвакуацыя пацярпелага ва ўмовах нулявой бачнасці.

Сапраўды, падчас пажару ратавальнікі часта рухаюцца ў поўнай або частковай цемры, арыентуючыся збольшага, толькі на сцены і іншыя канструкцыі — літаральна намацваюць шлях наперад.

І таму, як адзначыў Дзяніс Ігнатовіч, кожны газадымаахоўнік ў звяне павінен або мець зрокавы кантакт з таварышам, або ўсведамляць яго прысутнасць праз гук ці дотык. А галоўнае правіла службы: колькі людзей зайшло, столькі і павінна выйсці. Гэта датычыцца як жыхароў ці наведвальнікаў будынка, так і саміх ратавальнікаў.

**Аміна НАЗАРАВА,**
**фота аўтара.**







Фота БелТА.

Як паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды, надвор'е па-ранейшаму нагадвае кліматычны расклад апошняга месяца восені.

НАДВОР'Е

# ТУМАН, ДАЖДЖЫ І ГАЛАЛЁД

## Удзень да плюс 10 °C

На старце гэтага тыдня сітуацыю будуць вызначаць атмасферныя франты, якія ссоўваюцца з Заходняй Еўропы. Чакаецца воблачнае надвор'е. Ноччу пераважна па заходняй палове, раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць ападкі ў выглядзе дажджу, мокрага снегу і снегу. У дзённыя гадзіны месцамі па краіне моцныя дажджы. У асобных раёнах слабыя туман і галалёд. Вецер паўднёвы, паўднёва-заходні ўмераны, месцамі парывісты. Тэмпература паветра ноччу складзе ад мінус 3 да плюс 3 °C, па захадзе Беларусі да 6 °C цяпла, днём — ад нуля па ўсходзе і да плюс 9 °C па захадзе краіны.

У сераду на большай частцы тэрыторыі нашай краіны дажджы, ноччу па паўднёвым усходзе з мокрым снегам. У асобных раёнах слабы туман, па ўсходзе слабы галалёд. Вецер заходняй чвэрці ўмераны, удзень месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы — ад мінус 1 да плюс 5 °C, удзень — ад плюс 2 да плюс 8 °C. На захадзе краіны ўначы — плюс 6-7 °C, удзень — 9-10 °C з плюсам.

Пацяплее ў чацвер, калі на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Вецер паўднёва-заходні, заходні парывісты. Тэмпература паветра ўначы не ніжэй за плюс 1—8 °C, днём чакаецца ад 3 да 10 °C цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Извещение об открытом аукционе по продаже земельных участков в частную собственность и на право аренды земельных участков с расположенными на них не завершенными строительством незаконсервированными (законсервированными) капитальными строениями 14 января 2026 года

| № лота | Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер | Площадь земельного участка (га) | Вид вещного права, целевое назначение земельного участка | Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения | Ориентировочные расходы на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации для проведения аукциона, руб. | Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; начальная цена земельного участка), руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Гродненская область, г. Ошмяны, ул. Коммунистическая, 30, 424950100001000605 | 0,0948 | Частная собственность, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме), код назначения 1 09 02) | Не завершенное незаконсервированное капитальное строение. На земельном участке расположен дом без кровли (фундамент бутобетон, стены ГСБ), хозяйственная постройка (фундамент бутобетон, стены кирпич), элементы благоустройства. Общая площадь здания 189,1 кв. м, хозпостройки 117,0 кв. м. Готовность: жилой дом 34,10 %, подвал 80 %, хозпостройка 33 %, ограждение 100 %, калитка 100 %, ворота 100 %. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: электроснабжение, водоснабжение, газоснабжение, связь | 1828,55 в том числе: 133,61 – техническая инвентаризация; 192,36 – определение оценочной стоимости; 96,00 – государственная регистрация прекращения прав на земельный участок; 1406,58 – публикации в СМИ | 69 961,67 (57 988,43; 11 973,24) | 7 000,00 |
| 2 | Гродненская область, г. Ошмяны, ул. Зыгмунта Минейко, 47, 424950100001002984 | 0,1349 | Частная собственность, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме), код назначения 1 09 02) | Не завершенное незаконсервированное капитальное строение. На земельном участке расположен фундамент жилого дома (бутобетон, перегородки ФБС). Площадь застройки 129,0 кв. м. Готовность: жилой дом 10,0 %. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: электроснабжение, водоснабжение, газоснабжение, водоотведение, связь | 1843,55 в том числе: 133,61 – техническая инвентаризация; 192,36 – определение оценочной стоимости; 111,00 – государственная регистрация прекращения прав на земельный участок; 1406,58 – публикации в СМИ | 15 821,03 (4 799,70; 11 021,33) | 1 600,00 |
| 3 | Гродненская область, г. Ошмяны, ул. Клинцевича, 17, 424950100001002108 | 0,1000 | Частная собственность, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме), код назначения 1 09 02) | Не завершенное незаконсервированное капитальное строение; На земельном участке расположен фундамент жилого дома (ФБС). Готовность: жилой дом 12,0 %. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: электроснабжение, водоснабжение, газоснабжение, водоотведение, связь | 1854,47 в том числе: 108,53 – техническая инвентаризация; 192,36 – определение оценочной стоимости; 147,00 – государственная регистрация прекращения прав на земельный участок 1406,58 – публикации в СМИ | 18 767,15 (9 517,15; 9 250,00) | 1 900,00 |
| 4 | Гродненская область, г. Ошмяны, ул. Черкасова, 37, 424950100001002235 | 0,1094 | Частная собственность, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме), код назначения 1 09 02) | Не завершенное незаконсервированное капитальное строение; На земельном участке расположен фундамент жилого дома (бутобетон), хозпостройка. Готовность: жилой дом 11 % (в т. ч. фундамент 100 %), площадь постройки 146 кв. м; хозпостройки – 93 %. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: электроснабжение, водоснабжение, газоснабжение, водоотведение, связь | 1818,47 в том числе: 108,53 – техническая инвентаризация; 192,36 – определение оценочной стоимости; 111,00 – государственная регистрация прекращения прав на земельный участок; 1406,58 – публикации в СМИ | 32 079,09 (21 959,59; 10 119,50) | 3 250,00 |
| 5 | Гродненская область, г. Ошмяны, ул. Красноармейская, 70А, 424950100001002752 | 0,0988 | Частная собственность, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме), код назначения 1 09 02) | Не завершенное законсервированное капитальное строение; На земельном участке расположен фундамент жилого дома (блоки железобетонные). Готовность: жилой дом 11,0 % (в т. ч. фундамент 90 %). Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: электроснабжение, водоснабжение, газоснабжение, связь. | 1818,47 в том числе: 108,53 – техническая инвентаризация; 192,36 – определение оценочной стоимости; 111,00 – государственная регистрация прекращения прав на земельный участок; 1406,58 – публикации в СМИ | 18 272,54 (8 194,94; 10 077,60) | 1 850,00 |

**Организатор аукциона** – Ошмянский районный исполнительный комитет, 231103, г. Ошмяны, ул. Советская, 103 (время работы с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, кроме выходных и праздничных дней, тел.: (8-01593) 22143, 22151.

**Аукцион состоится 14 января 2026 года в 11.00 по адресу: г. Ошмяны, ул. Советская, 103, кабинет 66.**

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Ошмяны, ул. Советская, 103, кабинет 70 в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00. Начало приема заявлений об участии в аукционе и прилагаемых к ним документов – **12 декабря 2025 года в 8.00,** окончание приема заявлений об участии в аукционе и прилагаемых к ним документов – **12 января 2026 года в 15.00.**

Для участия в аукционе по лотам №№ 1–5 приглашаются граждане Республики Беларусь, негосударственные юридические лица Республики Беларусь. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более граждан Республики Беларусь, негосударственных юридических лиц Республики Беларусь.

Для участия в аукционе гражданин Республики Беларусь и юридическое лицо Республики Беларусь (лично либо через своего представителя) в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием предмета аукциона, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключают с Ошмянским районным исполнительным комитетом соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Кроме того представляются:

гражданином Республики Беларусь – копия документа, удостоверяющего личность, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина Республики Беларусь – доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет № BY43AKBB36415230009794200000, УНН 500088419, в ЦБУ № 418 ОАО «АСБ «Беларусбанк» г. Ошмяны, БИК AKBBBY2X, получатель – Ошмянский райисполком, назначение платежа – внесение задатка для участия в аукционе, задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению

Размер увеличения цены земельных участков (шаг аукциона) – 5 % от предыдущей цены, называемой аукционистом.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220. Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение предмета аукциона как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан: внести плату за предмет аукциона; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, а также затраты на осуществление государственной регистрации прекращения права собственности земельного участка; осуществить в течение двух месяцев после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся государственную регистрацию прав на предмет аукциона в организации по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним;

осуществить завершение строительства одноквартирного жилого дома на предоставленном земельном участке в соответствии с действующим законодательством, разработанной и согласованной в установленном порядке проектной документацией в течение трех лет с даты государственной регистрации земельного участка.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими в рабочее время с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по требованию).

**Контактные телефоны: (801593) 22151, 22143, 22145, 22139.** Адреса сайтов: Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **http://gki.gov.by,** Гродненского областного исполнительного комитета **http://region.grodno.by,** Ошмянского районного исполнительного комитета **https://www.oshmiany.gov.by.**

СПОРТ-ТАЙМ

# БЕЛАРУСКІ ДАБІЛІСЯ «ПАЦЯПЛЕННЯ» АД МІЖНАРОДНАГА ЛЫЖНАГА САЮЗА

## У Ханты-Мансійску завяршыўся другі этап Кубка Садружнасці па біятлоне



Адзін з лідараў нашай каманды біятланістка Дзінара Смольская падвяла вынікі выступлення беларусаў на гэтых спаборніцтвах.

— Удалося выкласціся па поўнай і гэта радуе. Гэта былі вельмі важныя гонкі. Тут ёсць цікавасць для нас у плане ачкоў, якія можна зарабляць, ставіць сабе матывацыю. Я разумею, што ўсе сочаць. Да мяне падышлі балельшчыкі, уяўляеце, якія прыляцелі з Казахстана, і мне нават дзеля іх захацелася выйсці на гонку, каб яны не дарма прыехалі толькі на адзін старт, — сказала Смольская ў праграме «Вынікі тыдня» на тэлеканале «Беларусь 5».

Нагадаем, у спрынтарскіх гонках другога этапу Кубка Садружнасці Дзінара Смольская заваявала залатую ўзнагароду. Антон Смольскі і Ганна Сола прынеслі ў скарбонку зборнай па бронзавым медалі. Яшчэ адно «золата», але ўжо ў масстарце, на рахунку беларуса Дзмітрыя Лазоўскага.

Пасля двух этапаў міжнароднага турніру ў агульным заліку лідзіруе расійскі біятланіст Кірыл Бажын (440 ачкоў), дзеючы пераможца турніру Антон Смольскі саступае расіяніну 14 балаў.

Жаночы затал узначальвае расіянка Наталля Шаўчэнка (414), Дзінара Смольская ідзе трэцяй (388).

## Чатыры залатыя медалі заваявалі беларускія баксёры на мемарыяле Лівенцава

Беларусы заваявалі 25 медалёў XXII Міжнароднага турніру па боксе памяці Героя Савецкага Саюза Віктара Ільіча Лівенцава, які прайшоў у сталічным Палацы спорту.

Удзел у спаборніцтвах прынялі 100 спартсменаў з Беларусі, Кітая, Расіі, Таджыкістана, Туркменістана і Узбекістана, якія вызначылі прызёраў у 19 вагавых катэгорыях (11 — у хлопцаў і 8 — у дзяўчат). У актыве нашых баксёраў 4 залатыя, 9 сярэбраных і 12 бронзавых узнагарод. Перамогі ў фіналах атрымалі Юлія Апанасавіч (да 52 кг), Аліна Вэбер (да 81 кг), Данііл Крывіч (да 71 кг) і Мікіта Нагорных (звыш 98 кг).



## Беларускія баскетбалісты выйгралі турнір памяці Уладзіміра Рыжанкова

Баскетбалісты юнацкай зборнай Беларусі другі раз запар сталі пераможцамі міжнароднага турніру памяці Уладзіміра Рыжанкова, які завяршыўся ў Мінску.

У спаборніцтвах на пляцоўцы сталічнага спарткомплексу Рэспубліканскага дзяржаўнага вучылішча алімпійскага рэзерву падапечныя Андрэя Клемезя апярэдзілі равеснікаў з Расіі, Казахстана і Азербайджана. Найлепшым гульцом турніру прызнаны беларус Уладзіслаў Сатыраў.

У спаборніцтвах дзяўчат першынствавалі расіянкі, другімі сталі азербайджанскія баскетбалісткі, беларускі заваявалі бронзавыя ўзнагароды.

Турнір памяці першага міністра спорту і турызму, першага прэзідэнта Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі Уладзіміра Рыжанкова заснаваны ў 1996 годзе. За свае заслугі Уладзімір Мікалаевіч удастоены званняў «Заслужаны работнік фізічнай культуры і спорту», «Заслужаны трэнер БССР», узнагароджаны граматай Вярхоўнага Савета БССР, прызам і памятным медалём Міжнароднага алімпійскага камітэта.

## Спартыўны арбітражны суд прызнаў незаконным адхіленне беларускіх спартсменаў ад міжнародных спаборніцтваў

Старшыня беларускага саюза канькабежцаў Юлія Комлева пракаменціравала сітуацыю з допускам нашых спартсменаў на міжнародную арэну.

— Пераканана, што рыторыка міжнароднага спорту ў адносінах да беларусаў цяплее, перш за ўсё, дзякуючы той барацьбе, якую вядзе наш Нацыянальны алімпійскі камітэт. Барацьба ў добрым сэнсе слова дыпламатычная, перагаворная. Многія нашы віды спорту падалі апеляцыю ў CAS. І я віншую наш лыжны саюз з тым, што яны выйгралі гэтую апеляцыю. З вялікім болем адзначаю, што пакуль не дапушчаны фрыстайлісты і біятланісты, але дзякуючы гэтай зладжанай рабоце Нацыянальнага алімпійскага камітэта, Міністэрства спорту і непасрэдна кожнай зімовай федэрацыі, мы бачым гэтыя зрухі ў цёплы бок, і вось ужо канькабежны спорт, фігурнае катанне, лыжныя віды атрымліваюць ліцэнзіі. Вядома, вельмі хацелася б спадзявацца на тое, што па фрыстайле і біятлоне таксама будуць прыняты своечасовыя рашэнні, і нашы спартсмены змогуць прыняць удзел у зімовай Алімпіядзе, — сказала Комлева.

Нагадаем: раней Спартыўны арбітражны суд (CAS) прызнаў незаконным адхіленне беларускіх і расійскіх спартсменаў ад спаборніцтваў з боку FIS. Рашэнне датычыцца лыжнікаў, снаўбардыстаў, фрыстайлістаў і скакуноў з трампліна — усе яны атрымаюць магчымасць выступіць на Алімпійскіх гульнях у Італіі ў нейтральным статусе.






Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

9 СНЕЖНЯ Даты Падзеі Людзі

**1960** год — нарадзіўся Ігар Міхайлавіч Пракаповіч (г. Паставы Віцебскай вобл.), беларускі пісьменнік, краязнаўца. Аўтар кніг «Рэха малітваў», «Фізічная геаграфія Пастаўскага раёна», артыкулаў па гісторыі і геаграфіі Пастаўскага раёна, апавяданняў і п'ес.

**1895** год — нарадзілася Далорэс Ібарury, дзеяч міжнароднага камуністычнага і працоўнага руху, старшыня Камуністычнай партыі Іспаніі (з 1959 г.).

**1905** год — нарадзіўся Інакенцій Пятровіч Герасімаў, расійскі географ, геамарфолаг, глебазнавец, акадэмік АН СССР (1953 г.). Арганізатар і першы дырэктар Інстытута геаграфіі СА РАН (1957—1959 гг.). Аўтар работ па геаграфіі глеб, геамарфалогіі, палеа- і фізічнай геаграфіі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1973 г.).

**1968** год — дзень нараджэння камп'ютарнай мышы. Менавіта ў гэты дзень вынаходнік Дуглас Энгельбарт на канферэнцыі па вылічальнай тэхніцы ў Сан-Францыска прадэманстраваў у рабоце першую ў свеце камп'ютарную мыш. Вынаходства ўяўляла сабой драўляны куб на колцах з адной кнопкай. Сваім імем камп'ютарная мыш абавязана праводу — ён нагадваў вынаходніку хвост сапраўднай мышы.

**2010** год — была падпісана Дэкларацыя аб фарміраванні Адзінай эканамічнай прасторы на тэрыторыі Мытнага саюза Расіі, Беларусі і Казахстана. У дэкларацыі было заяўлена, што, «развіваючы Мытны саюз і АЭП, ЕўрАзЭС рухаецца да новай формы інтэграцыі — Еўразійскага эканамічнага саюза».

ПАДПІСКА-2026

# МАЙ ДЭВІЗАМ ВА ЎСЕ ДНІ: СА «ЗВЯЗДОЮ» — НА КАНІ!



*Бо яна адзіная — са штодзённых — беларускамоўная, бо найстарэйшая (першы нумар выйшаў у 1917-м, а значыць, паважаная яшчэ нашымі дзядамі-прадзедамі), бо «родная, на роднай мове», бо СВАЯ, здольная радаваць не толькі патрэбнай, цікавай інфармацыяй, добрымі парадамі ды народным гумарам, але і дарэчнымі падарункамі, прычым з першых нумароў года.*

*Даўнія падпісчыкі ўжо здагадаліся, што гэта — прыгожыя звяздоўскія календары: насценны, рэлігійны, народных свят і, вядома ж, месяцавы, з дапамогай якога, прыклаўшы ручкі, нашмат лягчэй вырошчваць добры ўраджай.*

*Хочаце мець іх, усе чатыры, хочаце пражыць наступаючы 2026-ы, як на кані праехаць (чытай — ладна, з задавальненнем, з карысцю), то не забудзьцеся аформіць падпіску (на месяц, на квартал, на паўгоддзе) і, магчыма, не толькі сабе.*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11 129. Індэкс 63850. Зак. № 2690.

Нумар падпісаны ў 19.30 8 снежня 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12